*Вітаемся радасцю* ☞ 3




# Ніва

**ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ**


*25 Сакавіка ў Гданьску* ☞ 8




http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl


**№ 15 (2500) Год XLIX** **Беласток, 11 красавіка 2004 г.** **Цана 2,00 зл.**







*Віншуем нашых Чытачоў з Вялікаднем!*

# Хрыстос Уваскрос!

З вялікім святам адвечнага аджыўлення віншую цябе, Вялікі Беларускі Народ!

Гэтай вялікай ночы страсі з сябе ўсю пагарду, увесь бруд, каторым аблепліваюць цябе ад вякоў. Чыста вымыйся, прыбярыся ў найлепшую вопратку, каб хоць на адзін дзень стаў ты роўны з усімі. Ідзі туды, дзе пачуеш гэтыя вялікія словы:

— Хрыстос Уваскрос!

Услухайся ў іх. Якая вялікая сіла, які ўсёажыўляючы змест захованы ў іх. Ці не чуеш, як радасцю надзеі, радасцю скорага ўваскрэсення вее на цябе ад гэтых слоў:

— Хрыстос Уваскрос!

Радуйся, мой родны край. Надзея, як жывучая вада, ліецца ў тваю душу. Скора і ты ўваскрэснеш ад доўгага мёртвага сну. Вясна прыйшла да цябе:

— Хрыстос Уваскрос!

Над ім здзекаваліся. Яго білі па твары, сцябалі бізуном. Плявалі на Яго. Кпілі з Яго. У канцы распялі і распятага не пераставалі мучыць. Спечаныя смагай вусны звільжывалі воцатам і жоўцю. Ён памёр на крыжы паміж двух разбойнікаў. Але ўсё ж такі

— Хрыстос Уваскрос!

Уваскрос Хрыстос, і крыж, раней знак пагарды і сораму, зрабіўся святыняй усяго свету. Мукі Хрыстовы змылі ўсё з яго. І штогоду вялікай вясенняй ночы тысячы цэркваў і касцёлаў свецяцца агнямі свечак, ліецца радасны пераклік званоў, крыж падымаецца над мільёнамі схінёных галоў і ў паветры носіцца радасны шэпт:

— Хрыстос Уваскрос!

Што гавораць табе званы, Беларускі Народ? Ці не віншуюць яны цябе і з тваім уласным вялікім святам? Скора ж і ты ўваскрэснеш! Ад вякоў пагарджалі табой, тваёй мо-



Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*Хрэсны ход у Орлі ў Вялікую пятніцу — канец 1990-х гадоў*

вай; ад вякоў мелі за быдла, годнае толькі на цяжкую, надсільную работу. Не давалі табе расці і развівацца. Воцатам чужой культуры звільжалі твае спячоныя смагай свету вусны. Лепшых тваіх сыноў адрывалі ад цябе, прымушалі іх зрабіцца здраднікамі. А цяпер пышаюцца імі, называюць іх сваімі.

А хіба ж яны не любілі цябе? Хіба ж лепшы жар свайго сэрца ахвяравалі яны не табе? А дзе яны?

Іх няма з табой. З самага малку адарвалі ад роднай глебы, атруцілі здрадай. І іх, тваіх дзяцей, маюць за зброю проці цябе.

Цябе катавалі. Ты цярпеў мукі, але не ўмёр. Глыбока, глыбока ты захаваў сваю душу.

Хрыстос быў з табой у тваіх муках; і Ён разам з табой цярпеў іх. Колькі разоў распіналі Яго разам з табой! Больш разоў, чым ёсць пясчынак на дне мора! Але кожнага году па ўсёй Беларускай зямлі разносіцца кліч:

Дагэтуль мы плачам, дагэтуль мы стогнем,

Адвечных не можам пазбыцця слёз...

Ты ўжо перастанеш плакаць. Ты падняў свой твар, з надзеяй ловіш зыкі званоў:

„Бом! бом!.. Прачынайся ад сну, Беларусь! Годзе стагнаць ды жаліцца, жальба нічога не дасць табе. Уставай! Ідзі будаваць зруйнаваную Бацькаўшчыну!"

Наперад па шчасце! Хай злое ўсё дрогне!

Вясна ўжо на свеце — Хрыстос Уваскрос!

Я бачу, як святлее твой твар, мой родны краю. І, поўны сілы і веры, я крычу ва ўсю моц тваім нівам, лясам і балотам, тваім панурым вёскам, тваім пакрыўджаным сынам:

— З вялікім святам віншую! З вялікім святам, Вялікі Беларускі Народ!

— Хрыстос Уваскрос!

**Сяргей Палуян (1910 г.)**


## *Ніўскія Вялікадні* ☞ 2

Віталь Луба

*У пачатках дзевяностых гадоў „Ніва" ўключылася ў, так бы мовіць, катэхізацыю чытачоў. Тады магчымасці заснаваць у сродках масавай інфармацыі для праваслаўных беларусаў былі намнога меншыя, чым цяпер. Таму на нашых старонках з'явіліся рэлігійныя гутаркі а. Канстанціна Бандарука...*

## *Польшча ў Еўрасаюзе* ☞ 2

Яўген Мірановіч

*Уваход Польшчы ў Еўрасаюз можа стаць вельмі цікавым палітычным эксперыментам. Упершыню эліты з дробнашляхецкім менталітэтам будуць інтэграваца з зонай мяшчанскай культуры. Камунізм, як сістэма існуючая на іерархічнай аснове, быў шмат у чым падобны на феадалізм. Таму ў Польшчы быў ён даволі натуральнай з'явай...*

## *Абдурылі Яновіча* ☞ 4

Мацей Халадоўскі

*Самаўрадавую ўладу ніхто не прымушаў да візіту, а, што за гэтым ідзе, да якіх-небудзь абяцанняў. Дастаткова было выслаць віншавальны ліст. Аднак жа — не. У афіцыйнай заяве напісалі тады: „Маршалак Януш Кшыжэўскі здакляраваў фінансавую падтрымку Маршалкоўскай установы ў выданні твораў сабраных пасля «Трыялогаў», міжнародных літаратурных сустрэч у Крынках...*

## *На палескай дрыгве* ☞ 5

Ганна Кандрацюк

*Сапраўды, трэба мець літаратурнае ўяўленне пра палескія балоты, каб зрабіць як мы — рушыць аўтобусікам праз дрыгву. Або ўпартасць Паўла Мажэйкі...*

## *Беларускія спартсмены* ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

*Алімпійскія гульні ў Аўстраліі выдаліся даволі паспяховымі для беларусаў. Усяго на далёкі астраўны кантынент прыбыло 140 спартоўцаў нашай краіны. У неафіцыйнай класіфікацыі паводле набраных ачкоў (яны налічваюцца за першыя восем месцаў у кожнай дысцыпліне) прадстаўнікі Беларусі занялі 16-е месца сярод 199 удзельнікаў...*

## *Занатоўкі кантрабандыста* ☞ 10

Сымон Нальшанскі

*Было гэта акурат перад Вялікаднем. Для кантрабандыста сама працоўны час. Кожны чалавечак хоча назапасіць алкаголю на свята, а попыт вызначае прапанову. Галоўны закон бізнесу! Вось і кінуліся ўсе са сваімі прапановамі ў Польшчу...*

# Ніўскія Вялікадні



*Перыядычны друк — адлюстраванне не толькі фактаў, але і пануючай у даны момант атмасферы, звычаяў, моды ў шматлікіх галінах чалавечага жыцця. Крыніцай ведаў пра згаданыя фактары ў беларускім асяроддзі несумненна з'яўляюцца старыя штогоднікі „Нівы". Даволі часта гартаю падшыўкі ў пошуках бія-бібліяграфічных вестак (прыдаўся б бібліяграфічны даведнік па ніўскіх публікацыях) і знаходжу шмат цікавага. Напярэдадні Уваскрэсення Хрыстовага маю ўвагу прыцягнуў спосаб адзначання Вялікадня на нашых старонках у мінулым, тым больш што з пятнаццацігадовай перспектывы працы ў рэдакцыі быў я сведкам змен, якія праходзіла рэдакцыя ў пачатку дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя.*

*Ва ўмовах ПНР, калі абавязваў дзяржаўны атэізм, усе рэдакцыі, у тым ліку і „Ніва", віншавалі чытачоў з Вялікаднем як вясенні святам, пазбягаючы ў графічным афармленні рэлігійных сімвалаў (пераважалі кураняты, пісанкі, пальмы). У святочных нумарах даваліся таксама матэрыялы прымеркаваныя да свята. Напрыклад, у 1957 г. можна было прачытаць апавяданне Змітрака Бядулі „Велікодныя яйкі", вясковы абразок пяра Васіля Баршчэўскага „У Вялікдзень" ды парады „Як захавацца каля стала", у якіх (зб) перасцерагала, між іншым, ад залішняй выпіўкі. У гэтым перыядзе звычайна друкаваліся таксама этнаграфічныя матэрыялы аб вясенніх абрадах беларусаў.*

*Разам з палітычнай адлігай і ў канцы са зменай дзяржаўнага ладу на старонках загасцявала рэлігійная тэматыка. У велікодным нумары ад 1988 г. апрача віншаванняў друкавалася размова з а. Рыгорам Сасной аб значэнні Тысячагоддзя хрышчэння Русі, фотарэпартаж аб разбяру Янку Салавянюку — афарміцелю інтэр'ера Свята-Троіцкай царквы ў Гайнаўцы, а ў „Зорцы" перадрукаваны быў адпаведны фрагмент „Новай зямлі" Якуба Коласа. У наступным годзе велікодныя святы супадалі з Першамаем і тады мы павіншавалі чытачоў наступным чынам: „Найлепшыя велікодныя і першамайскія пажаданні чытачам ад «Нівы»", за што атрымалі далікатны папрок ад зычлівага нам святара. У „Зорцы" тады Віктар Швед апублікаваў верш „Вялікдзень". Год пазней, у 1990 г., велікоднай тэматыцы прысвечана была старонка „Прысутнасці". Студэнты змясцілі на ёй адпаведны фрагмент Евангелля ад Мацвея, верш Наталлі Арсенневай „Велікодным раннем" і легенду пра велікоднае яйка. А першая старонка „Нівы" пачыналася з верша Янкі Купалы „Хрыстос Уваскрос".*

*У пачатках дзевяностых гадоў „Ніва" ўключылася ў, так бы мовіць, катэхізацыю чытачоў. Тады магчымасці заіснаваць у сродках масавай інфармацыі для праваслаўных беларусаў былі намнога меншыя, чым цяпер. Таму на нашых старонках з'явіліся рэлігійныя гутаркі а. Канстанціна Бандарука, багаслоўскія артыкулы Славаміра Назарука, друкаваліся Велікодныя пасланні архіепіскапа Савы ды інтэрв'ю з мітрапалітам Васіліем (1996 г.) і архіепіскапам Сіманам (1997 г.). Пры нагодзе апошняга інтэрв'ю аказалася, што мы, як журналісты, не надта разбіраемся ў царкоўным тытуляванні. Архіепіскап Сіман да адказаў на нашы пытанні далучыў ячшчэ лісток з формамі зваротаў да праваслаўных іерархаў, які нам служыць дапаможнікам да сённяшняга дня. Пачаткова мелі мы таксама клопаты з беларускай рэлігійнай тэрміналогіяй. У БССРаўскіх слоўніках гэты пласт лексікі адсутнічаў. Калі ў Рэспубліцы Беларусь сталі з 1993 г. выходзіць „Беларускія праваслаўныя каляндары", а за імі іншая царкоўная літаратура на беларускай мове, было ўжо нам у рэдакцыі на што абаперціся.*

*У сувязі з тым, што праваслаўнымі і каталікамі Вялікдзень вельмі часта святкуецца ў розных тэрмінах, звычайна віншавалі мы чытачоў двойчы. Аднаго году забыліся мы змясціць святочныя прывітанні каталікам, што не прайшло незаўважна. Пакрыўдзіўся за гэта наш шматгадовы карэспандэнт з Сакольшчыны светлай памяці Эдвард Шчасновіч, аб чым сказаў падчас свайго апошняга візіту ў рэдакцыі.*

*Гледзячы з перспектывы мінулага можна хаця б на прыкладзе Вялікадня сказаць, што адбываецца паступовае вяртанне да ўласных каранёў і цэласнасці культуры.*

**Віталь Луба**

# Для Еўрасаюза няма альтэрнатывы



*Нечакана для назіральнікаў палітычнага жыцця ў Польшчы пачаў рассыпацца Саюз левых дэмакратаў. Адзін з палітыкаў правай арыентацыі гэты працэс назваў паланізацыяй посткамуністаў. Меў ён на ўвазе той факт, што да гэтага часу ў такі спосаб паводзілі сябе дзеячы нацыяналістычных груповак, якія кароткатэрміновa паказваліся на палітычнай сцэне краіны. На гэтым фоне СЛД быў сімвалам стабільнасці, кансалідацыі і арганізацыйнай разважлівасці. Пасля перамогі на апошніх выбарах партыя, атрымаўшы ўладу ў краіне, сапраўды пайшла шляхам згодным з нацыянальнай традыцыяй палякаў. Арганізацыя, якая выступала ў інтарэсе плебейскіх масаў, стала яшчэ адной дробнашляхецкай групоўкай. Дзяржаўны апарат у руках шляхты заўсёды абазначаў палітычную анархію, вялікія падаткі і заканадаўства дазваляючае тэрарызаваць найбольш актыўных грамадзян у галіне вытворчасці.*

*Уваход Польшчы ў Еўрасаюз можа стаць вельмі цікавым палітычным эксперыментам. Упершыню эліты з дробнашляхецкім менталітэтам будуць інтэграваца з зонай мяшчанскай культуры. Камунізм, як сістэма існуючая на іерархічнай аснове, быў шмат у чым падобны на феадалізм. Таму ў Польшчы быў ён даволі натуральнай з'явай. Капіталізм з мяшчанскай культурай выступаў тут у інцыдэнтальным вымярэнні. Перспектыва ўваходу ў мяшчанскі Еўрасаюз ужо цяпер выклікае страх сярод партыйных дзеячаў нацыянал-сацыялістычнай арыентацыі — Лігі польскіх сем'яў, Самаабароны, Права і справядлівасці. Дамагаюцца яны рэферэндуму ў справе еўрапейскай канстытуцыі і заклікаюць грамадства адкінуць гэты дакумент, які мае быць галоўнай платформай еўрапейскай інтэграцыі.*

*Вынікі апытання грамадства з апошніх месяцаў паказваюць, што хутка паменшваецца адсотак палякаў зацікаўленых уваходам у еўрасаюзную супольнасць. Дзеячы нацыяналістычных партый палохаюць грамадства перспектывай затраты нацыянальнай тоеснасці і кантролю над дзяржаўнай маёмасцю, лібералізацыяй у галіне культуры і светапогляду. Па логіцы гэта вельмі падобныя аргументы да тых, якімі камуністы палохалі грамадства ў семідзесятых ці васьмідзесятых гадах. Існуе вялікае праўдападабенства, што канстытуцыйны рэферэндум стане галасаваннем „за" або „супраць" Еўрасаюза. Калі сітуацыя будзе развівацца ў гэтым самым напрамку што сёння, тады альтэрнатыўным варыянтам для Еўрасаюза можа стаць улада ў руках нацыяналістычных груповак. Грамадскі і палітычны патэнцыял гэтай арыентацыі — даволі вялікі.*

*Банкруцтва СЛД адкрывае перспектывы ўсялякім дэмагогам. Грамадства ніхто з палітыкаў не ўспрымае сур'ёзна. Падтрымку на выбарах да гэтага часу атрымлівалі тыя, што больш абяцалі. Таму амаль ніводная партыя, ідучы на выбары, не мае праграмы. Каб атрымаць перамогу яна зусім непатрэбная. На патрэбы выбарчай кампаніі палітычныя кланы рыхтуюць толькі некалькі лозунгаў, якія, як часовую малітву, паўтараюць пасля кандыдаты на паслоў, сенатараў, радных. У сённяшнім палітычным сезоне модныя нацыяналістычныя лозунгі і яны напэўна будуць дамінаваць у час бліжэйшай выбарчай кампаніі ў еўрапарламент, а таксама Сейм і Сенат. Ніякія перашкоды этычнага кшталту не ў змозе стрымаць імкненне да ўлады тых, якім яна з'яўляецца найвышэйшай мэтай, крыніцай прыбытку, дабрабыту і ўплываў.*

*З пункту гледжання беларускай меншасці для Еўрасаюза няма альтэрнатывы. Уваход Польшчы ў Еўрасаюз гэта таксама перспектыва еўрапеізацыі Беласточчыны, дзе цяпер большасць мясцовых элітаў, не ўспамінаючы пра грамадства, думае катэгорыямі падобнымі да ўсялякіх бурых, лупашкаў, млотаў, гузараў. З матэрыяльнага пункту гледжання ў Еўрасаюзе пэўна лягчэй жыць не стане, але можа быць больш нармальна, справядліва і менш крывадушна чым цяпер.*

**Яўген Мірановіч**

*Тым часам мінула 1 красавіка і пачаўся штогадовы час польскіх эксмісій. Беластоцкае тэлебачанне падало, што сёлета будзе іх у сталіцы ваяводства значна больш чым у мінулых гадах...*

**Вачыма еўрапейца**

# З цукрам у ЕС



Ну, вось, і ўваходзім мы ў гэты Еўрасаюз. Нават і тыя, каму не хочацца. Пакуль што, адчувальныя вынікі гэтай важкай падзеі паўплывалі на цану цукру. Калі пішу гэты тэкст, у маёй краме кілаграм белага парашку каштаваў 3 злотых, а ў Катавіцах, як інфармавала публічнае тэлебачанне, даходзіла нават да 5 злотых. Ад тае панікі стаў я церці свае вочы ад дзіву. І ад таго іх праціранне змяніліся яны з польскіх на еўрапейскія, што, пэўна, пільныя чытачы заўважылі ў загалоўку гэтага цыкла.

Але вернемся, да цукровай панікі. Размаўляў я аб гэтым з адным беластоцкім бізнесоўцам, някепскім знаўцам рынку і эканомікі. Пераканаў ён мяне, што не толькі прадпрыемствы і аптовыя склады, якія займаюцца цукрам, павышаць цэны да 1 мая. Аднак, пазней яны вернуцца да нормы, значыць, да еўрасаюзнага ўзроўню. Больш таго, могуць яны быць нават крышку паніжаныя, бо рынак збыту — у сувязі з запасамі, якія парабілі прадбачлівыя грамадзяне, скурчыцца прынамсі на пару месяцаў.

Але цукровую паніку папярэдзіла іншае здарэнне, якое нясмела перасмыкнулася праз СМІ. На інтэрнэтавых старонках Еўрасаюза асабіста старшыня Еўрапейскай камісіі Рамана Продзі запачаткаваў старонкі на мовах новых членаў, сярод гэтага паявіліся і польскія. Ледзь не ў той самы час прадстаўнікі ваяводскіх самаўрадаў г.зв. Усходняй сцяны наладзілі паразуменне, у рамках якога маюць яны змагацца за паправу бытавання жыхароў гэтага рэгіёна.

— Не бяда нас злучае, а адлегласць ад Польшчы і Еўропы, — гаварыў маршалак Януш Кшыжэўскі, кандыдат СЛД у Еўрапарламент.

Як бачым, нават еўрасаюзныя інтрэнэт-старонкі па-польску тэта факты не зменяць. Таму ў чарговы раз чарговая ўлада апрацоўвае „Стратэгію развою Усходняй сцяны", у гэты раз да 2013 года. Некалькі такіх дакументаў ужо створаны, і нават паспелі прапасці ў адхланні чыноўніцкіх пісьмовых сталоў. Нераз, як было са стратэгіяй Уніі вольнасці, разам з партыямі, якія яе падтрымлівалі. Тым часам мінула 1 красавіка і пачаўся штогадовы час польскіх эксмісій. Беластоцкае тэлебачанне падало, што сёлета будзе іх у сталіцы ваяводства значна больш чым у мінулых гадах. Мабыць, таму, што будуць выконваца і тыя, якія былі часова адменены, м.інш. з-за недахопу сацыяльных кватэр. Што цікава, тых апошніх не стала зусім больш, хоць прадбачаны новыя эксмісіі. Можа і тыя, хто адчувае з гэтай прычыны пагрозу, масава выкупляюць цукар. Заўсёды можна нагнаць гарэліцы і запіць рэальнасць, з якою няма сілы змагацца, чакаючы ажыццяўлення чарговай стратэгіі развою, а адлегласць да Польшчы і Еўропы цудам меншая раптам не стане.

**Мацей Халадоўскі**

*Цяпер пішу апавяданні, прадаўжаю аповесць. А вось ці адважуся ўсё гэта паслаць у Беласток і ці „Ніва” рашыцца зноў друкаваць мяне — не ведаю; я ж цяпер не толькі царкоўнік, але і архіепіскап...*

# Хрыстос Уваскрос! Вітаемся радасцю



**Размова з праваслаўным архіепіскапам Лодзінскім і Познанскім д-рам Сіманам РАМАНЧУКОМ.**

***— Як праходзіла Ваша духовае ўзрастанне і выспяванне?***

— Усё пачалося з дому, з сям’і, са школы ў Нараўцы, дзе ў бедныя пасляваенныя гады як жа цудоўна навучылі нас кахаць кнігі, спеў, прыроду, дзе побач была царква, у якой я з маленства чытаў і спяваў на службах, дзе адначасна плылі мары быць бацюшкам, настаўнікам, мастаком, аптэкарам (лекарам не, бо ён прымушаў нас штодзённа піць рыбін тлушч). Увесь час маёй вучобе спадарожнічала Царква, так збываліся мае мары, так я ўзрастаў і выспяваў.

***— Якое месца ў гэтым працэсе адводзіце сваім караням, а якое духоваму сілкаванню звонку?***

— Без каранёў і зелле не расце. І я не стаў бы архіепіскапам, каб не мае цудоўныя Бацькі — пакойная Мама Марыя, Тата Аляксандр, якому ідзе 94-ы год, сястра Ніна, мае сваякі, суседзі, мае нараўчанскія і бельскія настаўнікі, бацюшкі. Усё маё адтуль родам: і мова, і песні, і сум, і радасць.

У 1968 годзе, у час чэхаславацкага неспакою, калі мір павіс на валаску, я ў цудоўным Парыжы, дзе перада мною прынадныя навуковыя і царкоўныя перспектывы, рашаю вяртацца дамоў. У Варшаве мае польскія сябры дзівавяліся: „Ты ашалеў!” Ці ж яны ў змозе зразумець, што я тужу без маёй пушчы, рэчкі, поля, што для мяне мілей пальмаў нашы бярозы-сястрыцы, якіх нідзе больш такіх няма.

***— Вы, Уладыка, займаецеся дапледаваннем усходнеславянскіх літаратур. Прысутная Вам і цяга да ўласнай літаратурнай творчасці. Ці можаце рассакрэціць, што цяпер на Вашым творчым стале?***

— Літаратура, гэта мае з дзяцінства па сёння няспынныя любоў і радасць. „Сваіх” пісьменнікаў з сусветнай літаратуры месца тут няма называць. Любоў мая пастаянная — Дастаеўскі; ува мне не адзін з ягоных персанажаў жыве.

Маё ўласнае пісанне яшчэ са студэнцкіх гадоў, на трох мовах: беларускай, рускай, польскай. Захапляўся мною лодзінскі „Русский голос” ды і наша „Белавежа” не лічыла мяне лішнім у 60-70-х гадах. Калі я быў ужо ў Варшаве, больш за ўсё друкаваўся ў царкоўных выданнях, што не заўсёды сярод „белавежцаў” было „mile widzianą rzeczą”. Адзін з нашых літаратурных тузоў і дамагаўся выкінуць з літаб’яднання „Сімана-царкоўніка”; іншыя, слава Богу, былі разумнейшымі. Ды на нядаўні юбілей „Белавежы” і мне запрашэнне прыслалі; на жаль, быў я тады за граніцай.

Цяпер пішу апавяданні, прадаўжаю аповесць. А вось ці адважуся ўсё гэта паслаць у Беласток і ці „Ніва” рашыцца зноў друкаваць мяне — не ведаю; я ж цяпер не толькі царкоўнік, але і архіепіскап... Будзе відна як не сцямнее, кажуць у народзе.

***— Ваша епархія ахоплівае карэнна польскія землі, дзе праваслаўе абапіраецца на дыяспары. Як у такіх умовах складваецца Ваша душпастырская праца?***

— Мая цяперашняя душпастырская дзейнасць адбываецца сярод раскінутай па ўсёй цэнтральнай Польшчы дыяспары ў гарадскіх парафіях, часта заснаваных грэкамі яшчэ ў 18-м стагоддзі. Але якія гэта гарады! Лодзь, Пётркаў, Чанстахова, Кракаў, Сасновец, Каліш, Познань, Кельцы, Радам, Влацлавак, Торунь, Быдгашч — адзін перад другім старэйшы, прыгажэйшы, слаўнейшы! Тут праваслаўныя ездзяць у храм па 30, 50, 100 кіламетраў (у міжваенны час цэрквы ўзарвалі або замянілі на касцёлы). Тут праваслаўныя беларусы, украінцы, рускія, палякі, лэмкі, балгары, сербы, македонцы, чорнагорцы, грузіны, румыны, грэкі, арабы, эфіопы і іншыя. Трэба іх аб’яднаць у адну царкоўную сям’ю, што ўсе мы тут і стараемся зрабіць. Гасподзь абдарыў мяне моўнымі здольнасцямі і мне не цяжка амаль кожнага хоць кароткім словам прывітаць на яго роднай мове. Дай Бог усялякаму пабачыць радасць на людскіх тварах у Пасхальную Ноч, калі мы вітаемся радасцю Уваскрэсшага Хрыста больш чымсьці на дзесяці мовах, калі свяцім пасачкі, прывезеныя за 50-70 кіламетраў. Гэта і ёсць плён Уваскрэшання ў Царкве, пра які апостал Павел пісаў: „Дзе няма ні грэка, ні яўрэя, (...) варвара, скіфа, нявольніка ці вольнага, бо ўсім ува ўсіх ёсць Хрыстос” (Кал. 3,11).



*У час студэнцкіх гадоў у Мінску*

***— У багатых краінах Захаду наглядаецца адыход людзей ад рэлігіі. Ці іхні дабрабыт ступляе іх увагу да глыбінных крыніц існавання, ці мо заняпад аўтарытэта прападведнікаў?***

— Захад па свайму складу і філасофіі жыцця, якая склалася ад пакаленняў, заўсёды быў больш практычны, там заўсёды менш было містыкі і цягі да ўзвышанасці. Гэта ж толькі на праваслаўным Усходзе пачуеце „Дасць Бог дзянёк, дасць і яду” і пабачыце гэта ў рэальнасці. Тут заўсёды, як і Дастаеўскі пісаў, ішло евангельскае: сэрцы майце на небе, бо там толькі і ёсць наша прытулішча.

Сытасць, сённяшні заходні кансумерызм, усё ступляе; наеўшамуся да адвалу толькі спаць і хочацца — ды гэта ж не толькі ў фізіялагічных адносінах. Бягучы да сытага стала (не толькі стала-мэблі), губіць па дарозе ўсё райскае, узвышанае, бо адно перад ім: мець, узяць, у другога адабраць. Абамлелыя ад сытасці прападведнікі такімі ж як усе становяцца.

***— У Польшчы адбываюцца экуменічныя набажэнствы. Як Вы бачыце перспектывы гэтага працэсу? Ці бакі бачаць узаемныя каштоўнасці, якія можна прыняць у сябе?***

— У 1980 годзе ў Варшаве і ў 1982 годзе ў Лодзі я быў першым праваслаўным епіскапам, які прымаў у праваслаўных храмах епіскапаў іншых веравызнанняў і наведваў іх на студзеньскіх экуменічных набажэнствах. І парыў гэты з абодвух бакоў быў сардэчны і праўдзівы. Але потым усё змянілася і я астыў у сваім парыве. У заходняй канфесіі ўвайшла бурнай хваляй палітыка і пра нас пачалі забываць, а памяць вярталася пры патрэбнасці рапарту начальству і фатаграфій. Студзень, і толькі адзін тыдзень, а потым цэлы год быццам усе вымерлі, ніхто і не загляне. Бо няма духу і сэрца, бо адзінства не ў адміністрацыі, а ў Алтары і Прычасці, чаго няма паміж Усходам і Захадам. Калі аб’яўлена, што збаўленне толькі ў Заходняй Царкве, няўжо нам, праваслаўным, сваё роднае-дарагое ўсё кідаць і шукаць лепшага? Калі ж у нас усё ёсць! Няўжо нам, польскім аўтакефальным праваслаўным, шукаць на Захадзе чарговай адміністрацыйнай залежнасці, калі мы сталі незалежнымі ад Канстанцінопаля і Масквы? У нас цяпер усё сваё: свае сані, свой вазак, свае коні, свая дуга і едзем мы па адной у свеце з усімі праваслаўнымі дарозе. Вольныя і раўнапраўныя, дзе ніхто нікога на калені не ставіць, дзе адзінымі вуснамі і адзіным сэрцам усе — як браты родныя, сардэчныя — славім Хрыста і спяваем: „Слава ў вышніх Богу і на зямлі мір, у чалавеках благаваленне”. Гэту песню можна спяваць толькі вольным будучы і веруючы, што „з намі Бог”, Бога-Чалавек-Хрыстос, а не чалавека-бог, які не кахае, а забівае.

***— Шчыра дзякую за размову.***

**Размаўляў Аляксандр Вярбіцкі**

*Пагінуць малыя падляшскія гаспадаркі, а вяскоўцы астануцца парабкамі без працы і хлеба...*

# Людзі баяцца Еўрасаюза

Неўзабаве май 2004 года — уваход Польшчы ў Еўрасаюз. Некаторыя грамадзяне нашай краіны вельмі гэтаму рады, некаторыя — баяцца ЕС, асабліва пенсіянеры, чорнарабочыя ды сяляне.

Міністр Гаўзнер павышаючы пенсіі ў сакавіку заявіў, што павышэнне абавязвае на два гады. У пераважнай большасці былі гэта невялікія грошы і, агульна кажучы, павышэнне пенсій аказалася быць малазаўважальным у партфелях пенсіянераў, бо ў той жа час павышаны былі цэны многіх харчовых прадуктаў і паслуг. Пенсіянерам не палепшылася жыццё, а пагоршала.

Неўзабаве, калі адбудзецца зраўнанне айчынных цэн на прадукты і тавары з еўрасаюзнымі, то пенсіянерам, беспрацоўным і звычайным чорнарабочым — хоць ты жывым лезь у зямлю. Пагінуць малыя падляшскія гаспадаркі, а вяскоўцы астануцца парабкамі без працы і хлеба. Перастануць ездзіць па вёсках аб'язныя крамы, бо не вытрымаюць еўрасаюзных санітарных нормаў, а новых крамаў не будзе каму будаваць. Старыя пенсіянеры не змогуць даехаць у горад за пакупкамі неабходных тавараў, бо прадпрыемства ПКС адменіць нерэнтабельныя аўтобусныя маршруты. Прыйдзе час, калі людзі стануць праклінаць чыноўнікаў, што давялі краіну да такога заняпаду. Што было дзяржаўнае, лепшае чыноўнікі распрадалі за бясцэнак сваім ашуканцам або бізнесменам-чужынцам, якія цяпер увальняюць рабочых з працы, развальваюць прадпрыемствы, а свае тавары прывозяць з-за мяжы і дыктуюць уладам свае цэны, а ты нічога не скажаш. Найгорш баюся таго, што калі адбудзецца „пяты падзел" Польшчы, то яна ўжо больш не адродзіцца, загіне навекі. Гэта будзе вельмі страшны час.

**Мікалай Лук'янюк**

# Новае ў Гайнаўцы

Сёлета ў чэрвені ў Гайнаўцы здадуць у карыстанне гарадскі амфітэатр. Побач яго запланавалі яшчэ пабудову спортпляцоўак для вайлейбола і баскетбола ды тэнісных кортаў.

Будзе пакладзены асфальт на брукаваным адрэзку вуліцы Беластоцкай, а таксама на стаянках аўтамабіляў каля Гайнаўскага дома культуры.

Зараз рыхтуюць дакументацыю на комплексную перабудову вуліцы Баторыя ў цэнтры горада (пабудова вадасцёкавай каналізацыі ды асфальтаванага палатна), падключэнне святлафораў на скрыжаванні вуліц Баторыя і Ліпавай ды Баторыя, 3 Мая, Паркавай і Зіна. Запланавалі таксама пабудову скрыжавання з кругавым рухам на стыку вуліц Баторыя, Спартыўнай і Дзевятоўскага.

**(яц)**

# Абяцанкі-цацанкі

*Сакрат Яновіч „czuje się upokorzony" самаўрадавай падляшскай уладай як пісьменнік і шэф Згуртавання „Villa Sokrates", якое папулярызуе беларускую літаратуру ў свеце і сусветную на беларускай мове.*

*Але, вернемся да пачатку. У палове мінулагодняга ліпеня ў дом Сакрата Яновіча ў Крынках, сядзібу Вілы Сакрата, завіталі падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі ды старшыня падляшскага сейміка Збігнеў Кшывіцкі. Пасля сустрэчы на інтэрнэт-старонках Маршалкоўскай установы можна было прачытаць: „Спатканне з Сакратам Яновічам Януш Кшыжэўскі і Збігнеў Кшывіцкі пачалі ад таго, што павіншавалі яго з нагоды атрымання прэстыжнай узнагароды імя Анджэя Дравіча, якая назначаецца штогод выбітным сусветным індывідуальнасцям за ўклад у памнажэнне ролі і значэння польскай спадчыны ў свеце". Фактычна, некалькі дзён раней уся Польшча ў перадачы ў прамым эфіры магла ўбачыць, як тую ўзнагароду (і немалую сумку грошай) уручае пісьменніку з Крынак у агародах Прэзідэнцкага палаца сам Аляксандр Квасьнеўскі.*

*Самаўрадавую ўладу ніхто не прымушаў да візіту, а, што за гэтым ідзе, да якіх-небудзь абяцанняў. Дастаткова было выслаць віншавальны ліст. Было жа — не. У афіцыйнай заяве напісалі тады: „Маршалак Януш Кшыжэўскі здакляраваў фінансавую падтрымку Маршалкоўскай установы ў выданні твораў сабраных пасля «Трылогаў» [міжнародных літаратурных сустрэч у Крынках у рамках дзейнасці „Villi Sokrates" — М. Х.] у штогодніку «Annus Albaruthenicus», а таксама гутарак мастака «Пад знакамі Арла і Пагоні»". Далей было адзначана: „Ініцыятыва артыста, — як гэта акрэсліў маршалак, — вартая асаблівай увагі і падтрымкі. Тычыцца яна галіны вельмі ўражлівай, менавіта нашай супольнай культурнай спадчыны, нашай зямлі, нашых грамадзян".*

*Таму цяжка здзіўляцца, калі некалькі месяцаў пазней паказалася кніга „Пад знакамі Арла і Пагоні" з падзякамі на першых старонках за фінансавую дапамогу ў яе выданні Маршалкоўскай установе. Былі, гэта, аднак, словы падзякі навырост. Грошай, абяцаных у час візіту ўлады ў Крынках — не было. Сакрат Яновіч далікатна прыпомніўся маршалку, высылаючы восенню ліст. Адказу, аднак, не дачакаўся. Прыйшоў ён сёлета, на пачатку сакавіка. Але не ад маршалка, а ад члена маршалкоўскай управы, адказнага за культуру ў рэгіёне — Яна Сычэўскага, старшыні Беларуская грамадска-культурнага таварыства. Адмовіў ён абяцаных маршалкам Кшыжэўскім і старшынёй Кшывіцкім грошай „ze względu na bardzo ograniczone środki finansowe na kulturę i ochronę jej dóbr".*

*— Гэта мяне шакіравала. Да таго ўзроўню, што пайшоў я ў крынкаўскі банк і скапіраваў тое пісьмо ў некалькіх экземплярах, — кажа Сакрат Яновіч. — Справа была ў ледзь 4 — 5 тысячах. Ян Сычэўскі думае, што толькі БГКТ — прадстаўнік беларускага асяроддзя і яго патрэб. Усё іншае трактуе як дыверсійнае і непатрэбнае.*

*І дадае:*

*— Калі б маршалак Кшыжэўскі фактычна цікавіўся тым, аб чым размаўлялі мы ў Крынках, такога дзеяння не было б. Бачыў ён сябе як хроснага бацьку „Трылогаў". Калі б фактычна так было, цікавіўся б лёсам сваіх дзяцей. Аказваецца, усё тое вынікае з чыноўніцкага пачуцця лаялізму ў адносінах да прэзідэнта Квасьнеўскага і ахвоты паказацца.*

*У выніку — Сакрат Яновіч сам заплаціў за публікацыі.*

*Маршалак Кшыжэўскі вуснамі свае прэсінфарматаркі Бажэны Бэднарэк так пакрывачаста тлумачыць тую сітуацыю ад імя зацікаўленых справай чыноўнікаў:*

*— Гэта не было абяцанне. Пан маршалак дапамогу толькі здакляраваў. Аказалася гэта быць немагчымым на ўзроўні фінансавых рашэнняў.*

*— Але чаго ж дакляраваўся, калі ўжо раней было вядома, што гэта праўна немагчымае?*

*— Пан маршалак не мусіць ведаць усіх працэдурных спраў. Яго абяцанні не могуць быць трактаваныя як дакларацыі ўстаноў. Выказаў ён зацікаўленне і адабрэнне дзеяннем Сакрата Яновіча. Аднак, датацыя ў гэтым выпадку магла быць назначана толькі дэпартаментам культуры, якія падначалены Яну Сычэўскаму, прытым абедзве публікацыі паказаліся ў лістападзе і снежні, а датацыя на гэтую мэту магла быць акрэслена ў лютым. Рэфундацыя коштаў — немагчымая.*

**(мх)**

# Думкі пра Унію

Павятовае агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ў Гайнаўцы ў сялецтвах пасобных гмін абучала сялян афармляць дакументы на атрыманне непасрэдных саюзных даплат. У Кузаве заняткі праходзілі 9 і 11 сакавіка ў мясцовай святліцы. Было запрошаных 68 гаспадароў (34 у адзін дзень). Удзельнікам вучобы былі бясплатна выдадзены (у старостве трэба было б заплаціць) геадэзічныя выпісы з зямельнага кадастру, неабходныя для афармлення дакументаў. Зацікаўленне абучэннем было памяркоўнае: прысутнічала адпаведна 24 і 12 сялян. З таго што я прыкмеціў, большасць прыйшла дзеля таго, каб бясплатна атрымаць геадэзічныя выпісы, а не ўдзельнічаць у практычных занятках. Кузаўцы — у асноўным пенсіянеры. Гаспадарку яшчэ пры камуне перадалі яны дзецям, каб атрымаць пенсію. Зараз з маладых мала хто займаецца гаспадаркай. Зямлю апрацоўваюць адно старэчы, пакуль сілы хапае. У дыскусіі з выкладчыкам кузаўцы цікавіліся, ці атрыманыя даплаты не пашкодзяць работнікам на прадпрыемствах, або не прыйдзецца плаціць дадатковую складчыну ў КРУС. Працаўнік агенцтва не даў станоўчага адказу, але ўдзельнікі дыскусіі заявілі, што не стануць рызыкаваць і не будуць у гэтым годзе хадайнічаць за непасрэднымі даплатамі. Як будзе пазней, пакажа час.

* * *

Аб тым як бачаць жыццё на вёсках жыхары Кляшчэлеўскай гміны пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз, гаворыць бурмістр горада і гміны Аляксандр Сяліцкі.

— Грамадства падзелена на дзве групы. Маладыя аптымістычна спаглядаюць у будучыню. Лічаць на пашырэнне рынку працы, большыя зарплаты і лепшае жыццё. Сяляне старэйшага ўзросту кажуць проста: будзе горш. Непасрэдныя саюзныя даплаты не кампенсуюць коштаў вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў. Найбольш іх хвалюе магчымасць продажу свайго тавару ў невялікай колькасці.

Гміна арганізавала інфармацыйны пункт, у якім працаўнік гміны разам з прадстаўніком сельскагаспадарчай кансультацыі дапамагаюць сялянам аформіць дакументы на атрыманне статыстычнага нумара гаспадаркі. Як сказаў кіраўнік Павятовага агенцтва ў Гайнаўцы Мікалай Яноўскі, з Кляшчэлеўскай гміны паступіла найбольш заяў у гэтай справе. Гэта сведчыць аб тым, што кляшчэлеўскі самаўрад адпаведна ставіцца да ўмоў жыцця сваёй грамадскасці ў новых структурах Еўрасаюза.

**Уладзімір Сідарук**

# Клічкі і прывычкі

*Мы, як і кожны народ, любога чалавека ці нацыю любім ацаніць і па-свойму назваць — часам брыдка і няслушна, а часам і праўдзіва. Таму цікавы допіс Анны Садоўскай п.з. „Погляды на іншыя народы" („Ніва" н-р 11) хачу дапоўніць апісаннем таго, як у Дубічах-Царкоўных і суседніх мясцовасцях называюць г.зв. чужаземцаў, як іх любяць і не любяць. А наслухаўся я праз свае 37 гадоў на сваім паштовым участку, як гэта людзі рознага ўзросту „бласлаўляюць" іншых.*

*Усіх католікаў, у тым ліку палякаў, не вельмі любяць і называюць нацыяналістамі (толькі палякаў), але лодырамі не называюць.*

*А мы сябе папросту называем рускімі, але ніколі беларусамі. Гандляроў з Беларусі таксама называюць рускімі і толькі адзін я называю іх карэннымі беларусамі. Яны гэтым задаволены, лічаць, што я жартую, а гутараць з намі так жа як і мы, па-падляшску; значыць, не ўсё страчана ў нашых суседзяў за мяжой.*

*Рускіх называем рускімі, але ніколі кацапамі. Апошняе слова ўкраінскае і вялікі Мікалай Гогаль у сваіх „украінскіх" апавяданнях так тлумачыць: кацап — рускі чалавек з барадою. Таму гэта нічуць не ганебнае, як некаторыя лічаць, у тым ліку і палякі.*

*Украінцаў называем украінцамі і лічым іх блізкімі сваякамі, братамі. Слова хахол рэдка ў нас сустракаецца.*

*Пра яўрэяў ёсць розныя меркаванні, найчасцей адмоўныя, маўляў — яны хітрыя і каварныя абманшчыкі, якія між сабою жывуць у вялікай згодзе і не дазволяць пакрыўджанаму згінуць; не тое, што ў нас, калі адзін аднаго гатоў утапіць у лыжцы вады, калі таму ў жыцці пашанцуе. Мой бацька заўсёды меў добрае слова пра яўрэяў, высока іх цаніў і добра з імі жыў, калі ў міжваенны перыяд было іх многа ў Орлі і Бельску-Падляшскім; і яўрэі таксама шанавалі бацьку. Я, хаця асабіста з яўрэямі не знаёмы, шаную іх, бо гэта абраны Божы народ, з якога выводзіцца Хрыстос і Ягоная Маці Марыя; кляйміць яўрэяў можа толькі неразумны чалавек. Таксама Хрыстовы апосталы і ўсе старазапаветныя прарокі — яўрэі.*

*Пра татараў ці мусульман мала ў нас гаворыцца, бо нічога пра іх не ведаем, хаця частка нашай вёскі з боку Тафілаўцаў называецца Туркі. Цыганоў, у прынцыпе, людзі завуць злодзеямі і лодырамі. Немцаў называюць у нас гаспадарамі, амерыканцаў — сусветнымі капіталістамі, а пасля вайны з Іракам — разбойнікамі і злачынцамі.*

*Ад сябе магу дадаць, што ў кожным народзе ёсць людзі добрыя і дрэнныя. Калі б тыя дрэнныя бралі прыклад з добрых, мо тады лепш на свеце жылося б.*

**Мікалай Панфілюк**

# Дыскатэка на палескай дрыгве

*У Дубравай у адзінаццаць вечарам наладзілі дыскатэку...*

У найгоршы момант, калі, здавалася, заядуць нас камары і засмокча дрыгва — наляцеў дакорлівы ўспамін. Нядаўна мне моцна хацелася закапацца ў нейкай багне і схавацца ад свету. „Святы Мікалай Цудатворац, — падумалася мне пра заступніка падарожнікаў і Палескай зямлі, — захавай ад дурных мараў, бо яны спаўняюцца”.

* * *

Наша пуцяводная зорка, д-р Лена Глагоўская, спытала:

— Ці сапраўды хочам заначаваць над дзікім берагам возера Князь?

— Вядома, над дзікім, — захапіліся мы як адзін. Будзе вогнішча, песні і даклад пра Слуцкае паўстанне. Тут прытуліліся пасля паражэння атрады генерала Станіслава Булак-Балаховіча.

Легенды і былі пра возера не заахвочваюць да знаёмства з месцам. Паводле іх, тут знаходзілася сапраўднае гняздо д’ябла. У замку, на востраве, жыў люты князь, які не ведаў меры ў збродзе і лайдацтве. За грахі князя і за пакуты нявінных ахвяр крэпасць праваліла ў ваду.

У нас быў свой козыр. Раней у Тураве мы ўзброіліся ў духоўную падтрымку праваслаўных айцоў:

— Едзьце, а мы будзем за вас маліцца! — блаславілі на дарогу.

У той дзень мы ўжо перажылі жахалкі ў Століне і, на здаровы розум, нішто дрэннага не магло ўжо паўтарыцца. Думалі — перад намі цудоўны вечар. Атхланне гаючай прыроды, зорнае неба, гарэліца „Беларусь сінявокая”...

Б-р-р-р!

* * *

Найперш, у Століне, я заблудзілася. Сяджу сярод гарадскога рынку і думаю як стацца невідзімкай. Вакол, як назойлівы шэршань, кружыць міліцэйскі варанок. Я без прапіскі і дазволу на прабыванне ў памежнай зоне. Без грошай, багажу, без пашпарта. З адным фотаапаратам.

— Эй, цётка! Здзелай нам фотачку, — клічуць мяне хлопцы з будынка рэстарана.

— З якой ты газеты? — пытае чарнабрывы.

— З „Нівы”, чуў ты пра такую?

— Канешна!

Файна, — думаю. Бо далей ідзе пытанне пра Беласток, ці не ў Літве ён часам.

Запрашаюць у рэстаран, а я адчуваю як ажывае манія праследу. Відаць, спецыяльна пакінулі мяне тут у чужым горадзе, як шкоднага ката ў лесе, — думаю пра сяброў. Ненавіджу ўсіх і сябе разам.

Але вось у мой бок ідзе збаўленне — наша Домна.

— Мы ў сталовай чакаем, — паясняе, — тут, недалёка.

Маўчым пакуль не пабачым...

— О, matko! — заклінае Домна. Сярэдзінай вуліцы вядуць маладога каня з паламаным дышлем. Ззаду двух дзядзькоў нясуць гнаіцу, іншы дугу і хамут.

— Відаць, саромяцца фурманкай праз горад ехаць, — пачынаю жартаваць, — разабралі па часцях і пераносяць на другі канец горада.




*Русалка ў Століне*

Домне не да смеху, а яшчэ больш не да смеху Міры Лукшы.

— Гэты конь ледзь нас не здратаваў, — кажа белая як палатно Міра. — Стаю і бачу — конь з паламаным возам ляціць проста на нас і нашу машыну. Цудам тут абышлося без ахвяр. Бо я паспела яшчэ сказаць замову, — дадае таемна Міра.

* * *

Сапраўды, трэба мець літаратурнае ўяўленне пра палескія балоты, каб зрабіць як мы — рушыць аўтобусікам праз дрыгву. Або ўпартасць Паўла Мажэйкі.

Спачатку мы ехалі цалкам грунтавай сцяжынай і замест спыніцца і разбіць абоз, перліся ўперад у пошуках дрэў. Першыя два-тры кіламетры хутчэй нагадвалі школьную экскурсію. На схіле дня сустрэча з возерам Князь (іншыя назвы — Жыд, Чырвонае), выклікала чуць не экстаз. Заходзіла сонца і велічнае люстра вады мянялася ружова-чырвонымі колерамі. З надбярэжнага кустоўя з крыкам узлятала дзікае птаства.

Гэтае найбольшае на Палессі возера мае толькі чатыры метры глыбіні (яго прастора займае 4 380 гектараў, максімальная даўжыня 12 кіламетраў і шырыня — 5 км).

Калі сонца схавалася і неба зацягнулі фіялетавыя хмары, мы зразумелі сваю памылку. Пасля чарговых кіламетраў наша дарога перамянілася ў зарослую кустамі сцяжыну з чырвона-іржавымі калюгамі. Паабапал яе высіўся двухметровы чарот. Не было як развярнуцца, ні спыніцца. Бераг возера раптам стаў дзікі і непрыступны. Ды і самая думка, каб вылезці з машыны, паралізавала. У паветры бзыкалі чорныя хмары прагных крыві камароў.

Дзякуючы ўпартасці Паўла Мажэйкі, мы ўсё перадзіраліся ўперад. Раптам наш бусік катастрафічна перакуліўся. За акном бліснулі лужы чырвонай вады. Недзе крычаў драпежны птах.

— Капец тут! — я падумала пра св. Мікалая Цудатворца.

— Едзь, едзь! — не адставаў Павел. Натхненне для далейшага перасякання балота даваў яму ўспамін яшчэ аднаго падарожніка, які, як мы, ехаў раней насустрач гэтай дарогай.

Дзядзька быў настолькі злосны, што на пытанне пра дарогу, адпаліў:

— Я тут першы і апошні раз!

— Ён жа не ўпаў з неба, — не адставаў пасля Павел, — мусіць быць дарога.

* * *

Калі ў канцы чаротавага тунеля блiснула святло — мы акрыялі. І нават кантакт з першымі напатканымі людзьмі, якіх у звычайным жыцці хацелася б абысці кругом, паказаўся прыемны.

— Не лезь, бо ўб’ю, — пачуў наш шафёр, калі спытаў пра дарогу, якую зараз перацяў нам шлагбаум. Побач стаяў бляшаны будан, каля якога таўкліся асобені ў фуфайках. Адзін з іх, адвярнуўшыся спіной, сікаў. Ці не папалі мы ў нейкі лагер для крымінальнікаў? У наш бок пасыпаліся маты.

Але вяртацца, хай і перацярэбленым шляхам, не было ахвотных. У канцы нам сказалі павярнуць убок і шукаць галоўнай дарогі.

Шлагбаум падымаў Павел Мажэйка (гэта напамінала кадр з тэлефільма Ю. Каліны пра нядаўняе зняволенне Паўла). Пасля яшчэ доўга штосьці *вадзіла* нас па дарогах, дзе здрадна панаваў пах газу. Урэшце, калі патрапілі на асфальт, адчулі — мы ацалелі.

Заначавалі ў доме культуры ў пасёлку Дубравая. У параўнанні з умовамі на прыродзе, савецкі дом культуры паказаўся пікам цывілізацыі. Ды яшчэ ў адзінаццаць вечарам тут наладзілі дыскатэку. Андрэй, наш сімпатычны шафёр, абтаньчыў усе мясцовыя прыгажуні.

А калі пасля танцаў мы выйшлі на двор перадыхнуць, мясцовыя маладзёны пераадолелі нясмеласць і спыталі:

— Таварышы ўчоныя, как вам у нас?

— Всё нармальна!

— А што луччэ всего ў нас?

— Возера Князь... з дзікага боку.

**Ганна Кандрацюк**

## Нашым братам

Беларусь — краіна, у якой хапае „і радасці, і ліха”. Гэта нашы ўсходнія суседзі і сябры. Кіраўніком дзяржавы з’яўляецца прэзідэнт, ад якога залежыць лёс народа і дзяржавы. Таму я жадаю беларусам розуму ў выбары ўлады. Каб яны выбралі чалавека, які ведаў бы, так як К. Каліноўскі, што „не народ для ўрада, а ўрад для народа”, каб ён выцягнуў гаспадарку з заняпаду. Я жадаю ім, каб яны мелі лепшае матэрыяльнае становішча. Яны павінны годна жыць. Вельмі важнае тое, каб людзі ганарыліся тым, што яны беларусы, каб памяталі словы Ф. Багушэвіча: „Калі мова гіне, дык гіне народ”. Таму я жадаю нашым братам з-за мяжы, каб яны без боязі вывучалі беларускую мову і гаварылі па-беларуску, памяталі, каб „не забыць і не аддаць нікому сядоў матчыных ног і слоў легенд старых” (А. Барскі). Цяпер вельмі цяжкую сітуацыю мае Таварыства беларускай мовы, ім хочуць адабраць залу, у якой яны сустракаюцца. Калі так будзе, Лукашэнку ўдасца знішчыць апошні беларускі аазіс. Я мару, каб яны маглі абараніць Таварыства ад ліквідацыі. Беларусы не могуць святкаваць 25 Сакавіка і іншых гістарычных дат, патрыятычная моладзь не мае дзе сустракацца. Калі яны прыязджаюць на „Басовішча” гавораць, што не могуць у сябе гаварыць пра вольную Беларусь, не могуць арганізаваць канцэртаў. Я хацела б, каб гэта змянілася. Беларусы павінны адчуваць сябе незалежнымі людзьмі, як гаворыць У. Арлоў „незалежнасць — гэта калі Беларусь будзе магла існаваць без «вялікага брата», які ўсё кантралюе”. Жадаю, каб здзейсніліся словы аўтара: „Каб кожны беларус пачуваўся сваім чалавекам на сваёй зямлі”. Я мару, як і хіба многа беларусаў, каб на сядзібе парламента залунаў бел-чырвона-белы сцяг — сімвал незалежнасці Беларусі. Я думаю, што Беларусь стане прыязным краем для ўсіх людзей і кожны беларус скажа, што гэта іх апора, кут, якога яны ніколі не забудуць. **(ег)**

## Наперад!

***водгукі***

*Навокал крычаць: Еўрасаюз! Для палякаў шчасце і „плюс”. Багатым мо і „адліга”, бедным пад нос — адна дуля-фіга. Толькі адны абяцанкі, пустыя словы, „цацанкі”. Мо будуць падаць нам галушкі з неба? Не перакінемся да іншага хлеба. Свет вельмі змяніўся, жулікам і хітрунам шырока адкрыўся. Не судзяць за крадзеныя мільёны, толькі зладзеям б’юць нізкія паклоны. А за грашакі будуць судзіць і польскае права да неба хваліць. А такія моцныя, што гузіка не аддадуць, адно вядома — краіну Захаду прададуць. Наш урад крайні і нашым лёсам шэбэнькуе разам з Амерыкай: на праўду і Лепэра злуе. Купілі заходнія танкі (і пацярпелі паасобныя банкі), таксама і самалёты — адны „граты”, але за акіянам — родныя браты. Хаця ўсё гэта — пустыя словы, больш за іх вартыя — гнілыя дровы, бо мы нічога не значым. Калоніяй Польшчу скора ўсе пабачым.* **(мп)**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Рыбалаўскія школьнікі і настаўнікі*

# Традыцыя і Вялікдзень

Сёлета разам святкуем Вялікдзень — і праваслаўныя, і каталікі. З гэтай нагоды мы завіталі ў Рыбалы. Чаму?

Тут усе разам — і праваслаўныя, і каталікі — вывучаюць беларускую мову. Прытым, трэцяя частка дзяцей — карэнныя палякі, іх бацькі прыехалі з розных куткоў Польшчы працаваць на мясцовай птушкаферме.

— Ужо тры гады як усе нашы дзеці знаёмяцца з беларускай мовай і традыцыяй, — кажа Вяслава Кандрацюк. Дырэктар паказвае лозунг: „Мой родны кут — як ты мне мілы...”!

Словы аўтара „Новай Зямлі” на ганаровым месцы — ля настаўніцкага кабінета.

— Наша місія, — кажа дырэктар, — захаваць традыцыю.

Як гэта выглядае на практыцы?

Ідзем у рэгіянальную ізбу. Па дарозе знаёмімся з класамі. У зале, дзе акурат адбываецца ўрок англійскай мовы, красуецца насценгазета прысвечаная беларускім пісьменнікам. Тут жа і бел-чырвона-белыя сцягі.

— Нядаўна нас наведаў Віктар Швед, — кажа дырэктар, — дзеці моцна перажывалі гэтую сустрэчу. Найперш выступіў паэт, пасля нашы вучні. Яны дэкламавалі вершы госця.

У рэгіянальнай ізбе сабраліся ўсе навучэнцы. Ад нулявога па шосты клас. У Рыбалах горстачка школьнікаў — усяго 38 асоб. Тут пачатковая школа, а потым ідуць яны ў гімназію ў Заблудаў.

Калі пачынаю гаварыць па-беларуску, на тварыках школьнікаў сімпатычныя ўсмешкі. Слухаюць з увагай, нават жэўжыкаватыя хлопцы. Нядаўна, паводле „Зоркі”, развучылі тут сонечны гіт з альбома „Я нарадзіўся тут” — „Сонца нам дапаможа”. І, вядома, заспяваюць мне.

Той, хто яшчэ не ведае слоў, глядзіць на сонейка, якое таксама ўліваецца ў клас. Найважнейшае — ўзаемнае зразуменне!

У рэгіянальнай ізбе многа вышыванак і папяровых карунак, а таксама ткацкі станок, хатнія і сельскагаспадарчыя прылады. Збіралі іх дзеці, настаўнікі ды школьная прыбіральшчыца.

— Юстына, заспявай нам песеньку, — намаўляюць нясмелую дзяўчынку.

У Юстыны няма выбару, усе аглянуліся ды глядзіць з дакорам. Кожны ведае, якая з яе спявачка. У канцы Юстына пераадольвае хваляванне і чысценька заводзіць „Ой, рэчанька, рэчанька”...

У класе цішыня... як макам засеялі. І нейк, чыста і святочна, як у перадвелікодны час.

— Proszę pani, a my chcemy powiedzieć wiersze, — азываюцца дэкламатары. Іх тут — хоць адбаўляй! Асабліва сярод наймалодшых. Многія падрыхтаваліся да конкурсу „Роднае слова”.

Слухаем вершы, адны смешныя, іншыя павучальныя і паважныя. Весела. Сыплюцца воплескі. Нехта хіхікае. Галоўнае — добры настрой.

— Усе нашы дзеці любяць беларускія песні і пастаноўкі, — адзначаюць Яўгенія Клімюк і Іаланта Мордань, настаўніцы беларускай мовы. — Прымаем удзел і ў прадметным конкурсе беларускай мовы.

Традыцыяй школы з’яўляюцца ўжо беларускія пастаноўкі на ёлку, тады выступаюць усе ахвотныя: і беларусы, і палякі. І гэтая цікавасць не замыкаецца ў школьных сценах. Наадварот. Тры разы ўся школа ідзе ў мясцовую царкву памаліцца за вынікі і поспехі ў вучобе.

А пасля ўрокаў — у вясковы клуб, каб пагуляць у тэатр. Тут здаўна ставяць беларускія і польскія спектаклі. І заўсёды заваёўваюць першыя месц.

**Зорка**

## *Мой Вялікдзень*

**Анэта Каральчук:** У Вялікую суботу ў маёй вёсцы асвячаюць пасху. Мне падабаецца наша традыцыя. Люблю хадзіць у царкву, а пасля разам з сям’ёю спажываць велікодныя стравы. На Вербніцу я іду ў царкву асвяціць вярбу. Апошні тыдзень разам з сям’ёй прыбіраю хату і панадворак — каб Бог гасцяваў у чысціні!

**Уршуля Дзмітрук:** У пятніцу іду ў царкву пакланіцца Плашчаніцы. Перад Вялікаднем асвячаем пасху. Раніцай у свята, разам з братам, мамай і татам сядаем за святочны стол. У Вялікдзень наведваем цёцю, якая жыве ў вёсцы Паўлы.

**Оля Гуль:** Найбольш люблю маляваць яйкі. Ужо да свята мама купляе фарбы і пчаліны воск, а пасля разам аздабляем крашанкі. Яйкі красяць у нас таксама ў цыбульніку.

**Ася Лукашэвіч:** Перад святам я іду асвяціць пасху, якую буду спажываць на Вялікдзень. Яшчэ некалькі дзён раней крашу яйкі. На Вялікдзень буду гуляць імі ў „бітку”.

**Паўліна Баран:** На свята з’язджаецца ўся мая сям’я, мы разам ідзем у царкву. Раніцай на Вялікдзень разгаўляемся яйкам і свянцонкай. Перад Вялікаднем я крашу яйкі, а пасля свят прыбіраю ў хаце.




*Мал. Паўлінкі (Белгімназія ў Гайнаўцы)*

**Івона Максімюк:** У Вялікую пятніцу іду ў царкву, каб пакланіцца Плашчаніцы Ісуса Хрыста. У Вялікую суботу красім яйкі. Малюем іх на некалькі спосабаў: каляровымі фарбамі і пчаліным воскам. Разам з сям’ёй іду на Усяночную багаслужбу, там асвячаем яйкі, пірог, каўбасу, соль, хлеб. Раніцай разам з сям’ёй спажываем яду. Вялікдзень асацыюецца мне з пісанкамі і вясной.

# Воўк[2]

*(беларуская народная казка)*

А ў чацвёртым двары тры каралевы жывуць. Выйшлі яны з палаца, распрануліся і купаюцца ў рэчцы. Воўк кажа:

— Я абярнуся ў лодку, а ты сядзь і цераз гэтую раку плыві.

Прыплыў дурань да іх, прывітаўся, добрую гутарку завёў. Просяць каралевы ў лодцы павазіць.

— Калі ласка!

Найперш села старэйшая. Павазіў яе дурань, прывёз на бераг і ўзяў другую. Пасля села трэцяя, наймалодшая і яе на свой бераг завёз. Селі яны на ваўка і едуць у трэці двор. Там воўк у каралеву абярнуўся і кажа на вуха наймалодшаму сыну:

— Як ад'едзеш на паўвярсты, успомні пра мяне і гукні: „Ах, ты мой шэры воўк, дзе ты астаўся!"

Едуць яны, едуць, забыў дурань пра ваўка. Раптам, на трэцяй вярсце ўспомніў пра яго і кліча:

— „Ах, ты мой шэры воўк, дзе ты астаўся!?"

Аглянуліся, бачаць бяжыць воўк, язык ад стомы высалапіўшы.

— Я цябе з'ем.

— Еш, твая воля.

Прыехалі ўсе ў двор. Воўк перакінуўся ў каня і за яго дурню Жар-птушку далі.

Ад'ехалі за тры вярсты як дурань пра ваўка ўспомніў.

— Ах, ты мой шэры воўк, дзе ты астаўся!?

Аглянуўся назад, бачыць воўк даганяе. Злосны як шэршань.

— Я цябе з'ем

— Еш, твая воля.

Калі воўк супакоіўся, кажа:

— Паехалі разам у двор бацькі.

У канцы лесу воўк кажа:

— Аставайцеся тут і пачакайце братоў. Глядзі, толькі не засні...

Сказаў і пабег у лес.

Надышла ноч. Прыйшлі браты з дарогі, бачаць — дурань спіць. Пабачылі дабро і ад зайздрасці забілі брата. Завалаклі яго ў лес і пакінулі пад кустом.

Знайшоў на другі дзень воўк мёртвага хлопца і толькі завыў. Што тут рабіць — бяда такая. Бачыць, чалавек пад лесам баранue. Адчакаў воўк, калі мужык у лес пойдзе, сам падбег і задушыў каня. Схаваўся і чакае. Зляцеліся крумкачы каня есці. Тут воўк схапіў найчарнейшае крумкачаня і кажа:

— Прынясіце жывучай крыві — тады аддам вам крумкачаня.

Паляцелі птахі па жывучую кроў. Прынеслі. Узяў воўк тую кроў, памазаў ёю каня і конь — устаў. Потым пайшоў да мёртвага брата, памазаў яму лоб — і чалавек ажыў.

Апошні раз воўк правучыў наймалодшага сына:

— У твайго брата вяселле, ідзі дахаты і падайся за жабрака. Папрасі, каб малодая табе хлеба прынесла. А калі будзе падаваць хлеб, ты ёй гэту палавіну пярсцёнка дай, што вы напалову разламалі. Воўк даў пярсцёнак і адбег.

Пераапрануўся хлопец за жабрака і пайшоў да бацькі. А там найстарэйшы брат з яго каралевай да шлюбу ад'язджае. Згаварыў жабрак малітвы і просіць маладой хлеба. Прынесла яна, падае ў рукі. Паказаў хлопец ёй палову пярсцёнка. Каралева нешта ўспомніла, адшукала сваю палавіну пярсцёнка, спалучыла дзве часткі, бачыць — злучыліся ў адно. Тады яна пазнала свайго хлопца. І з ім да шлюбу пайшла.

***(гак)***

# Валачобны конкурс!

Дарагі сябра!

Яшчэ нядаўна раслінны і звярыны свет часта перакліка́ўся з жыццём чалавека. Людзі верылі ў мову звяроў і дрэў, кожная раслінка і жывёліна мела сваю легенду і прызначэнне. Яны выкарыстоўваліся ў лячніцтве і магіі, абрадах і гульнях. Цяжка ўявіць, як многа залежым мы ад сябе!

А ці ўмееш правільна назваць расліны, якія растуць каля твайго дома? Ці, як многія дзеці, першую пралеску называеш проста — кветкай, а бярозку — дрэвам!?

Таму прапануем зараз табе ВЕЛІКОДНА-ВАЛАЧОБНЫ КОНКУРС. (Валачобнае — гэта крашаныя яйкі, якімі ў Вялікдзень абдароўваюць дзяцей іх хросныя бацькі).

Тваёй задачай будзе назваць ДРЭВЫ, якія растуць каля твайго дома (у садзе, парку, лесе) — на беларускай і польскай мовах, (добра будзе, калі дабавіце яшчэ як называецца дрэва на вашым дыялекце). У апошнім выпадку трэба назваць мясцовасць або гміну, адкуль вы родам, напрыклад:

1. Бяроза — Brzoza — Бэроза (Трывежа).

Усе, хто назаве больш за сем дрэў, прыме ўдзел у велікоднай жараб'ёўцы. **Наша рэдакцыя падрыхтавала не абы-якія ўзнагароды: кампакт-дыскі з беларускай рок-музыкай (між іншым, гурту „Н.Р.М."), касеты з беларускімі казкамі, кашулькі з надпісам „Басовішча" і беларускія кніжкі.**

Адказаў чакаем да 29 красавіка.

Тады неадкладна, напрыклад у час святочнага шпацыру, распытай пра дрэвы. Думаю, што кожны дарослы ахвотна табе падкажа.

***Зорка***



# Адмірал і яго каманда

**Адмірал**

Хто сказаў, што Беларусь не марская дзяржава? У нас таксама ёсць адміралы. І самы вядомы з іх — матылёк адмірал.

На аксамітна-чорных крылах адмірала, быццам на строгім марацкім кіцелі, яскрава пунсавеюць чырвоныя стужкі, якія відаць здалёк. Яны перакінуты цераз пярэднія крылы матылька пасярэдзіне, акурат як цераз плячо. Яшчэ дзве стужкі шырокімі чырвонымі лампасамі ляжаць па краях задніх крылаў.

Аднак, нягледзячы на такі вяцкі выгляд, наш адмірал зусім не ваюе з дрэвамі. А сталоўкаю яго чорным вусеням служыць чартапалох-татарнік ды крапіва. Хіба што ў канцы лета гэты матылёк наведваецца ў сады, бо надта любіць пасмактаць сок пераспелых сліў і груш, асабліва паданак.

Калі я сустракаюся з адміралам, дык адразу думаю пра будучыя вандроўкі па роднай зямлі і за яе межамі, пра што так хораша марылася ў незваротнаімклівым дзяцінстве.

Чэсць табе, адмірал!

***Уладзімір Ягоўдзік***

# Літаратурная пошта

***ЕВЕ К.*** *Дарагая Ева, вельмі мы рады знаёміцца з тваімі спробамі змагання з родным словам. Прабуеш выказаць свае думкі і рэфлексіі ў розных літаратурных жанрах. Больш, мабыць, усё ж, схіляешся да газетных форм, хоць хочацца табе напісаць „Арлекіна". У Тваім апошнім допісе (ужо друкуецца ў „Ніве"), дарэчы, напісаным на добрай беларускай мове, з малым лікам памылак, відаць тое перамяшанне стыляў. Атрымліваецца мяшанка прозы для паненак, дзе аўтар, замест разлічваць на кемлівасць чытача, выкладвае ўсё як на лапаце: вось, чытайце гісторыю нявінніцы, якую не кахаў хлопец, і яна і пампэ ад жалю, а, больш, ад невядома чаго; на канец паўтараеш яшчэ свае маралізатарскія рэфлексіі. Чытаецца ўсё тое лёгка, бо пішаш так, быццам вяжаш на прытках доўгі шалік простым узорам, але, без тваёй уласнай рэдактарскай працы — гэта яшчэ не проза. Чакаем, Ева, далейшых тваіх спроб. Працуй! І сама больш чытай добрай літаратуры.*

***АНІ А.*** *Вершы пішуць пра вядомае і невядомае. Кажуць, паэт піша за сваё жыццё адзін доўгі верш. У ім захапленне, здзіў, радасць, боль ад таго, што бачыш часам больш ад іншых. Вучань піша пра школу, айчыну, сяброў-чалавекаў і сяброў-звяроў, першае каханне. Відавочнасць і праўда ў прадстаўленай рэальнасці можа быць раз-два мастацкім прыёмам. Наша вёска, наш сакавік, наша лета. Хочацца, каб Ты, ужо вучаніца гімназіі, чые творы ўзнагароджваліся друкам, а гэта не жарты, вельмі ўражлівая дзяўчына, адчула патрэбу шырэйшага агляду і выявы станаў свае душы ды акаляючага свету. Чытай і вершы іншых. Працуй. Не здавайся на настаўніцы і рэдактараў, калі штосьці хочаш сказаць у літаратуры.*

***Міра Лукша***

# Польска-беларуская крыжаванка № 15

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку н-р 11:** Хмыз, рот, авал, бярозка, рама, жаўранак. Граб, вярба, хмара, лом, зара, зрок, ода, сто, сок.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Ева Казлоўская** з Бельска-Падляшскага, **Аня Артэмюк** з Аўгустова, **Рафал Тамашук**, **Дарота Цімашук** і **Паўліна Паскробка** з Дубін, **Марта Каліноўская** з Беластока. Віншуем!

# 86-я ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі ў Гданьску

**Вуліца Лукі Дзекуця-Малея**

25 сакавіка 2004 г. на сесіі Рады горада Гданьска адбылося ўшанаванне памяці Лукі Дзекуця-Малея — прысваенне яго імя вуліцы ў цэнтры Гданьска. На 26 прысутных радных за гэтай пастановай прагаласавалі ўсе. У 2002 г. з ініцыятывай такой назвы вуліцы выступіў Цэнтр хрысціянскай літаратуры, якую падтрымалі Форум супрацоўніцтва евангелічных хрысціян і Беларускае культурнае таварыства „Хатка”. Спярша аднагалосна прапанову адобрыла камісія культуры Рады горада Гданьска. У абгрунтаванні пастановы прэзідэнт Гданьска Павал Адамовіч напісаў:

*Ze względu na miejsce pochówku ś.p. Łukasza Dziekuć-Maleja na pobliskim Cmentarzu Garnizonowym lokalizacja ta jest najlepszą z możliwych. Podjęcie uchwały będzie godną formą uczczenia przez społeczność Gdańska 86 rocznicy proklamowania niepodległości Białorusi.*

*Łukasz Dziekuć-Malej urodził się 1 października 1888 r. w Słonimiu na Białorusi w prawosławnej rodzinie nauczycielskiej. Był duchownym protestanckim i jednocześnie jednym z czołowych działaczy niepodległościowych. W latach międzywojennych, mieszkając w Brześciu nad Bugiem, był inicjatorem i autorem przekładu „Nowego testamentu” na język białoruski. W 1946 r. pojawił się w Gdańsku, gdzie zdążyła już zorganizować się wspólnota chrześcijan-baptystów. Był zaangażowany w organizowanie szkolnictwa, prowadził ochronkę dla sierot, działał na polu międzywyznaniowym. Do ostatnich dni życia służył ludziom. Zmarł 20 stycznia 1955 r. W osobie Łukasza Dziekuć-Maleja odszedł do wieczności człowiek silnej woli, niezłomny bojownik o wolność, gorący patriota białoruski, zdolny organizator i administrator.*

*Nadanie ulicy jego imienia przyczyni się do wzmocnienia atmosfery ekumenizmu oraz poszanowania mniejszości narodowych i religijnych w Gdańsku. Wobec powyższego Prezydent Miasta Gdańska wnosi o podjęcie uchwały o nadaniu nazwy ulicy — Łukasza Dziekuć-Maleja.*



*Свае новыя і старыя балады спяваў вядомы ўжо на Узбярэжжы Віктар Шалкевіч (знізу)*

Пасля прыняцця гэтай пастановы на пасяджэнні Рады горада з падзякай выступілі: Лена Глагоўская — старшыня Беларускага культурнага таварыства „Хатка”, Данель Дзекуць-Малей — сын Лукі і прэсвітэр хрысціян-баптыстаў Міраслаў Паталён. Прысутнічалі таксама на сесіі Рады горада ўнучка Лукі Дзекуця-Малея — Альжбета і пастар хрысціян-баптыстаў Роберт Мікса. Нечаканым падарункам ад улад Гданьска для нас з нагоды 25 Сакавіка быў таксама букет бел-чырвона-белых цюльпанаў.

**Святкаванне беларусамі Трыгорада ўгодкаў БНР**

26 сакавіка 2004 г., у пятніцу, на гарнізонным могільніку ў Гданьску, на магіле Лукі Дзекуця-Малея беларусы і баптысты ўсклалі кветкі і запалілі знічы. Вянец ад улад горада Гданьска ўсклаў старшыня Рады горада Багдан Алешак. Прэсвітэр Міраслаў Паталён прачытаў над магілай 1 і 23 псальмы, якія пачаліся са слоў: „Шчаслівы чалавек, што не ходзе на раду бязбожных, не ўзыходзіць на шлях грэшнікаў і паміж насмешнікаў не засядае, але любасць знаходзе ў Законе Госпада і аб законе Ягоным разважае ўдзень і ўначы”. Таксама на магіле спадарожніцы жыцця Лукі Дзекуця-Малея, яго жонкі Серафімы, беларускай настаўніцы і дзяячкі, палажылі кветкі і запалілі знічы.

Вечарам у Сопаце ў Дворыку Серакоўскіх адбылася прэзентацыя кніг „Białorusini na Wybrzeżu Gdańskim” Лены Глагоўскай і „Od Budsławia do GUŁagu” Анелі і Веранікі Каткавічанак. На ўрачыстасць сабралася каля 50 соб, сярод якіх апрача мясцовых беларусаў варта згадаць віцэпрэзідэнта Гдыні Марка Стэмпу, начальніка Аддзела культуры, спорту і турызму Гарадской управы ў Сопаце Галіну Бярнацкую, упаўнаважанага прэзідэнта Сопата па справах няўрадавых арганізацый Дануту Трэмбінскую, а таксама дзяцей беларускіх дзеячаў звязаных з Узбярэжжам: Галіну і Юрку Дварэцкіх, Аліцыю Куніцкую-Фіялкоўскую, Здзіслава Мядоўскага, Данеля Дзекуця-Малея, Тамару і Мацея Канапацкіх. Сустрэчу вёў прафесар Гданьскага ўніверсітэта Анджэй Хадубскі. Кнігу ўспамінаў Анелі і Веранікі Каткавічанак прэзентавала яе перакладчыца, рэдактар Гданьскага радыё Анна Сабэцкая.

Свае новыя і старыя балады спяваў вядомы ўжо на Узбярэжжы Віктар Шалкевіч, які прымчаўся са сваёй неадлучнай гітарай з Гродна. Увесь канцэрт запісвала Радыё Гданьск, а яго арганізацыя была магчымая дзякуючы фінансавай падтрымцы сопацкіх гарадскіх улад. Святкаванні закончыліся ўрачыстай вячэрай у памяшканні Беларускага культурнага таварыства „Хатка” ў Сопаце па вуліцы Гафнера, 27 А.

**Лена Глагоўская**

# Варта вучыцца беларускай мове

У ваяводскіх элімінацыях Прадметнага конкурсу па беларускай мове для гімназій, якія адбыліся 22 сакавіка ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прынялі ўдзел 18 вучняў. Лаўрэатамі сталі Івона Маркевіч з ПШ № 3 у Бельску-Падляшскім (I месца), Паўліна Ігнацюк з Гайнаўскай белгімназіі (II месца) і Аліцыя Міранчук з Нарваўскай гімназіі (III месца).

— Можна сказаць, што лаўрэаты будуць прыняты ў выбраную імі школу незалежна ад колькасці кандыдатаў, якія захочуць паступаць у гэтую школу. У кожнай сярэдняй школе сустракаюць іх сур’ёзна і з прыхільнасцю. Лаўрэаты атрымаюць найвышэйшую ацэнку па беларускай мове на канец школьнага года. У Кураторыі асветы атрымаюць яны дыпломы і куратарскія ўзнагароды. У бельскай „тройцы” лаўрэаты прадметных конкурсаў атрымліваюць школьныя ўзнагароды і іх прозвішчы будуць вывешаны на школьнай дошцы, — паінфармавала старшыня конкурснай камісіі Тамара Русачык.

Вучні дзве гадзіны выконвалі практыкаванні і пісалі стылістычныя работы. Калі выходзілі з залы, настаўнікі-апекуны распытвалі іх пра ўражанні. Камісія некалькі гадзін правярала работы.

— Найцяжэй вучням было справіцца з простымі практыкаваннямі.



*Фіналісты ваяводскіх элімінацый конкурсу*

Многім складана было сумясціць прадметы з прафесіямі, падабраць сінонімы і дакончыць прыказкі. Добра ў гімназістаў атрымаліся творчыя працы. Напісалі яны цікавыя лісты да сваіх сяброў, падзякі за дапамогу і склалі разбудаваныя дыялогі, — сказала настаўніца Тамара Русачык.

— Мне найцяжэйшымі былі практыкаванні з тэкстам, — заяўляе Андрэй Грыгарук з Гайнаўскай белгімназіі, які ў ліку першых закончыў пісаць. — Нас беларускай мове вучыць пані Вольга Сянкевіч. Падабаюцца мне яе ўрокі. Горш, ці лепш, але ўсе гаворым па-беларуску. Яшчэ ў падставовай школе мяне мама запісала на заняткі беларускай мовы. Пасля з’явілася цікаўнасць да беларускай мовы і культуры. Аднак я найбольш люблю літаратуру. Чытаю вершы Віктара Шведа і творы Янкі Купалы.

— Цяжкавата было дакончыць прыказкі, а найлягчэй — падбіраць сінонімы, — кажа Юстына Тарасюк з бельскай „тройкі”. — Я беларускай мове вучылася з першых класаў падставовай школы. Зараз падабаецца мне і школа, і настаўнікі. У нас усе вучацца беларускай літаратурнай мове і мы з ёй ужо звыкліся. Я лічу яе ў нейкай ступені роднай. Я тут нарадзілася і мае бацькі размаўляюць на дыялектнай беларускай мове. На ўроках беларускай мовы, якія вядзе Валянціна Бабулевіч, мы вучымся і развіваемся. Я люблю чытаць апавяданні, а перад усім, творы Ларысы Геніюш. Граматыку таксама трэба вучыцца, асабліва да конкурсаў. Чытаем мы на ўроках „Ніву” і мне падабаецца, што пішацца там аб беларускіх справах, якія характэрны нашай беларускай меншасці.

— Найбольш складана было напісаць ліст, аналізаваць тэкст і дакончыць прыказкі, — паясняе Аліцыя Міранчук з Цімахоў, якая вучыцца ў Нарваўскай гімназіі. — Я ад другога класа падставовай школы вучуся беларускай мове і не шкадуюся. На занятках, якія вядзе Ніна Абрамюк, мы працуем у групах. З гімназістамі, якія вучацца беларускай мове ездзілі мы ў Гарадок. З бацькамі і бабуляй можна паразмаўляць па-свойму, а на ўроках знаёмімся з беларускай літаратурнай мовай, якую можна будзе выкарыстаць, калі б паехалі мы ў Беларусь.

— Мяне літаратурнай беларускай мовай зацікавіла настаўніца Анна Кандрацюк. На ўроках мы чытаем, спяваем і дэкламуем вершы. Я ездзіла ў Беларусь і добра ўспамінаю гэтую паездку, — кажа Агата Васільчык з Гімназіі ў Нараўцы. Яе сяброўка Бася Матысюк дабаўляе, што трэба вучыцца беларускай мове, бо ў яе вёсцы Семяноўцы ўсе гавораць па-беларуску.

**Аляксей Мароз**

**Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы**

Вольга Анацік

## Сяло пусцее

*Сяло нам пусцее,*
*Людзей убывае,*
*Праз годзікаў пару*
*Мала хто застане.*

*Маладыя людзі*
*У блёкі пайцякалі,*
*Каб на зямлі рабіць*
*Іх не застаўлялі.*

*Не хочуць у сяле жыць,*
*У горад выязджаюць,*
*Ды ўсё па вуліцах ходзяць*
*І работу шукаюць.*

*Бацькі старыя засталіся,*
*Будуць самі жыць.*
*Добра што пенсію маюць,*
*Ёсць за што харчы купіць.*

*Не дзіва, што маладыя*
*З сяла ўцякаюць,*
*Бо з гаспадаркі*
*Нічога не маюць.*

*Няма дзе збожжа,*
*Ні каровы прадаць.*
*І так прыйшлося*
*За пайдарма аддаць.*

*Малака не прымаюць,*
*Бо ў ім класаў шукаюць.*
*А ў адзін вялікі бак*
*Разам усё зліваюць.*

*А людзі старыя*
*На сяле ўміраюць,*
*І хаты пустыя*
*Дзецям пакідаюць.*

*Саломаю крыты*
*Тыя хаты старыя.*
*Да іх не вернуцца*
*Дзеці гарадскія.*

*Сяло нам пусцее,*
*Людзей убывае,*
*А той, хто застаўся,*
*Былое ўспамінае.*

# Дні беларускага фільма



Фота Аляксея Мароза

*Рэжысёр Юрый Ялхоў і Святлана Зелянкоўская (Анастасія Слуцкая)*

21 сакавіка ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы адбылося ўрачыстае адкрыццё вельмі важнага і так нам патрэбнага беларускага культурнага мерапрыемства — **Дзён беларускага фільма.** Патранаваў яму пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы.

Пасля рытуальных прамоў, наступіла праекцыя фільма „Анастасія Слуцкая”. Асабіста мне фільм гэты вельмі спадабаўся. Іншым удзельнікам, здаецца, таксама. У зале была мёртвая цішыня і ад пачатку ад канца адчувалася незвычайная, напружаная атмасфера. І не дзіва. Месца падзей гэтага гістарычнага фільма проста цудоўнае, як бы не з нашага часу і свету. Аж не верыцца, што ў наш час ёсць яшчэ такія прыгожыя, проста першабытныя, не знішчаныя цывілізацыяй мясціны. Не з нашай цывілізацыі былі і персанажы фільма, нашы продкі. А ўжо галоўная гераіня, князёўна Анастасія Слуцкая — проста жаночы ідэал. Яна прыгожая, разумная, верная, рашучая, баявая, якімі і павінны быць князёўны. І найважнейшае: яе ўменне карыстацца жывой, прыгожай беларускай мовай. Бо толькі і выключна гэтая мова ідэальна пасавала паказанаму часу, месцу і людзям, калі не хочам фальшаваць гісторыю.

І яшчэ вельмі важная дэталь, умела выкарыстаная ў гэтым фільме — моцная прысутнасць праваслаўнай веры і Бога ў жыцці нашых продкаў. А ікона Хрыста Збавіцеля проста ашаламіла мяне. Яна выконвае станоўчую ролю ў фільме. У суровыя часіны, якіх беларусам не шкадавала гісторыя, можна было выжыць і перамагаць мнагалікіх магутных прышэльцаў, толькі дзякуючы вялікай веры ў Бога і ў тое, што яны змагаюцца не толькі за сваё жыццё, свой быт, але і за Боскую праўду. У час цяжкіх выпрабаванняў яны ўжо бачылі не проста ікону, а жывога Збавіцеля з Яго крыху суровым, але справядлівым поглядам. І гэта прыдавала ім надзвычайных сіл у царкоўнай барацьбе. Вось і тут маем па сутнасці беларускі варыянт біблейскай легенды аб Давідзе і Галіяфе...

Фільм гэты проста маладзецкі і вельмі патрэбны нам, беларусам, бо ўмела навучае патрыятызму, якога дэфіцыт адчуваецца сярод сучасных беларусаў. І мы стваральнікам фільма павінны быць моцна ўдзячны за гэта.

Найбольшай аднак удзячнасці, па-мойму, заслугоўвае галоўная гераіня фільма. Яна бліснула сваёй прыгажосцю, талентам, патрыятызмам і як Анастасія Слуцкая ў фільме, і як Святлана Зелянкоўская на нашай сустрэчы пасля дэманстрацыі фільма. Прыгожа і змястоўна расказала яна аб працы над фільмам, аб цяжкасцях. Адкрыта заявіла таксама аб сваёй вялікай любові да Беларусі, яе гісторыі, культуры, мовы. Нам падабалася гэта і мы верылі ў шчырасць яе слоў, тым больш, што выражала гэтую любоў на прыгожай беларускай мове, бадай, найважнейшым атрыбуце беларускасці. Ой, не часта ўдаецца пачуць такое ад членаў афіцыйных беларускіх дэлегацый.

Ад многіх з іх напэўна не пачуеш беларускай мовы. Але, нават без такой нагоды, любяць пахваліцца сваімі радаслоўнымі яны, якія выводзяць то ад рускіх, то ад палякаў, то ад яшчэ далейшых зарубежнікаў. Абы толькі не ад беларусаў. Відаць, і беларускай мовай баяцца апаганіць сябе. Халопскія гэта натуры і менавіта так успрымае такіх свет.

Але вяртаймася да нашай сустрэчы. У ёй, на жаль, таксама пачалі выяўляцца пэўныя клопаты з беларушчынай. А нам тут, каб і зусім не спаланізавацца, як найбольш трэба прыкладаў добрай, прыгожай і жывой беларушчыны. І здавалася б, адкуль іх браць, як не з Беларусі? На жаль, і там з імі вялікі дэфіцыт.

Пасля прэзентацыі добрай, прыгожай і жывой беларушчыны Святланай Зелянкоўскай, выступіў рэжысёр фільма. Ён адразу заявіў, што будзе гаварыць па-руску. Высветлілася таксама, што і фільм гэты зроблены на рускай мове, а на беларускай мове выпусцілі толькі невялікую частку касет. Відаць, дзеля такіх упердліўцаў як я. Дзякуй ім і за гэта...

На маё наіўнае пытанне, чаму ў Беларусі робяць фільмы ў асноўным не на беларускай, а на рускай мове атрымаў адказ, што дзеля камерцыі.

— Калі так, то чаму не на англійскай ці кітайскай мовах? — падумаў я. — Іх жа больш, як расіян. Вось дзе быў бы гешэфт. Але хутка адкінуў гэту прымітыўную думку. І дайшоў да цвёрдага перакапання, што калі добры фільм зроблены нават на мове гансі ці мансі, якіх налічваецца толькі па некалькі тысяч, то хуценька перакладуць яго на іншыя мовы. І менавіта дзеля той жа самай камерцыі...

Потым выступіла яшчэ адна артыстка. Яна прабавала прамаўляць на беларускай мове, але не выйшла і яна перайшла на рускую, а потым на трасянку. Ні стуль ні зсюль яна з гонарам заявіла, што ніякая яна не беларуска, хаця па пашпарце яна і беларуска. Яе дзяды ці прадзеды былі палякамі. І не абы-якімі палякамі, а з уласным маёнткам. Маёнтак канешне прапаў, асталіся толькі мілыя ўспаміны...

Гэтая сумная вестка нас зусім дабіла. Такое няшчасце: мала што прапаў маёнтак, то яшчэ запісалі беларускай у пашпарце. Скандал страшэнны...

Наша сяброўская рада: на пастронак вінаватых і ў суд іх, мярзотнікаў...

**Васіль Сакоўскі**

PS. Каб не астаўляць Вас у мінорным настроі: жадаю Чытачам і Рэдакцыі прыгожай, цёплай вясны і вясёлых Велікодных Свят!

# Гістарычныя паслядоўнасці Люблінскай уніі

Палітычная і юрыдычная культура знайшлі адлюстраванне ў трох манументальных кадыфікацыях літоўскага права эпохі рэнесансу. Тры чарговыя Літоўскія статуты — 1529, 1566 і 1588 гадоў былі выяўленнем хуткага дасканалення прававой сістэмы Вялікага княства Літоўскага. II Статут насычаны элементамі рымскага права стаў законам, які абавязваў на ўкраінскіх землях таксама пасля іх інкарпарацыі ў Карону на патрабаванне шляхты гэтых зямель, якая адабрала інкарпарацыю таму, што здзейснілася яна шляхам з'яднання „роўных з роўнымі, вольных з вольнымі”, як апавяшчалі інкарпарацыйныя акты Валыні і Кіеўшчыны — а што было выразам распаўсюджання і на гэтых землях ідэй шляхецкай дэмакратыі.

III Літоўскі статут 1588 г. быў настолькі дасканалы, што прымяняўся ён у XVI-XVIII стагоддзях як дапаможны закон таксама ў Кароне, калі бракавала ў польскім праве адпаведнага правіла альбо суд палічыў яго няясным ці ўстарэлым. Абявязваў ён на Літве, Беларусі і Украіне доўга, бо аж да 1840 года.

Унія з Літвой ды інкарпарацыя паўднёва-рускіх зямель уцягнулі Польшчу ў працяглыя і знясільваючыя войны з Расіяй, а таксама стварылі розныя канфліктныя сітуацыі з Турцыяй. Аслаблялі таксама дзяржаву ўнутраныя канфлікты, як паўтараючыеся ад канца XVI ст. казацкія бунты. Ператварыліся яны ў 1648 г. у вялікае паўстанне пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага, вынікам якога быў працяглы крызіс шляхецкай Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, якая ў XVIII ст. стала больш аб'ектам, чым суб'ектам палітыкі ў Сярэдне-Усходняй Еўропе. Спробы



адраджэння суверэннасці на схіле стагоддзя, м.інш. праз Канстытуцыю 3 Мая, прыйшлі запозна.

Абагульняючы, польска-літоўская унія, заключаная ў Любліне ў 1569 г. была выбітным пачынам не праз сваю надзвычайнасць, але праз сваю працяглыасць — чатыры вякі, а ў грамадскай свядомасці значна даўжэй, бо аж да схілу XIX стагоддзя. У гістарычнай літаратуры падкрэсліваецца, магчыма, слушна, што тэрытарыяльная экспансія Рэчы Паспалітай ішла паралельна да развою шляхецкіх свабод і ў толькі мінімальнай ступені падтрымлівана была сілай. Пачын шляхты абедзвюх дзяржаў утрымліваўся настолькі доўга, як доўга шляхта, якая ажыццявіла яго, утрымлівала стырно ўлады ў Рэчы Паспалітай. Сёння падзеі уніі — супольная гістарычная спадчына палякаў, беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў. З цягам часу яе ацэнкі становяцца ўсё больш памяркоўныя, таксама і ў гістарыяграфіі нацый, якія акцэнтавалі да нядаўна крытычныя да яе адносіны. Сёння ў перавазе аб'ектывізм, які заўважае ў працэсах суіснавання і пранікання культур тагачасных „палітычных народаў” элементы істотныя для тоесnасці сучасных народаў, якія будуюць ці ўзмацняюць уласныя суверэнныя дзяржавы.

**Пятро Хомік**

*Правы чалавека так ці інакш парушаюцца амаль паўсюдна...*

# www.spring96.org

Цягам апошніх дзесяцігоддзяў адной з найбольш гучных тэм і пакуль нявырашаных праблем у свеце было і застаецца пытанне захавання правоў чалавека. Нягледзячы на шматлікасць народаў і этнасаў, адметнасць іх культур і традыцый, прагрэсіўна думаючыя людзі даўно прыйшлі да высновы, што правы чалавека — чыннік універсальны. Не залежыць ён ад колеру скуры, мовы і веравызнання кожнага паасобнага індывідума і таму ставіцца з павагай да правоў і свабод чалавека павінна кожная дзяржава, кожнае грамадства ў любым кутку зямнога шара.

На жаль, рэчаіснасць далёкая ад ідэала і правы чалавека так ці інакш парушаюцца амаль паўсюдна. Таму, каб неяк выправіць сітуацыю паўстаюць праваабарончыя грамадскія аб'яднанні. Пра адно з такіх — „Праваабарончы цэнтр «Вясна»" мы сёння і пагаворым. Дакладней пра адлюстраванне ягонай дзейнасці ў Інтэрнэце.

Сайт „Вясны" аформлены прафесійна і цікава. Зялёна-салатава-белае выяўленне, якое з'яўляецца на маніторы, калі карыстальнік набярэ адрас www.spring96.org, мае наверсе жоўты малюнак-загаловак з прамянёў узыходзячага сонца. На ім лагатып „Вясны". Калі ў зайшоўшага на сайт віртуальнага вандроўніка ўзнікла пытанне чаму праваабарончая арганізацыя называецца менавіта „Вясна" і чаму на інтэрнэтным адрасе відаць лічбу 96, то патлумачу. У 1996 годзе падчас масавых акцый пратэсту супраць палітыкі прыгнятання дэмакратычных правоў і свабод, пацярпелі некалькі дзесяткаў дэманстрантаў, якіх далей беларуская праваабаронцы ўзяліся абараняць у судах. Хаця пасля вясны 1996 года надышла восень-96 з яе сумнавядомым рэферэндумам і якая, вобразна кажучы, цягнецца дагэтуль, пераацаніць месца і ролю паўсталай праваабарончай арганізацыі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі цяжка. Каб у гэтым упэўніцца, дастаткова зазірнуць на падзагаловак „Пра Вясну", што знаходзіцца з левага боку галоўнай старонкі. Там жа, дарэчы, у падзагалоўку „Мы" можна завочна пазнаёміцца з „касцяком" арганізацыі, яе лідэрамі і актывістамі, чым яны займаюцца ў „Вясне" і што рабілі да свайго прыходу ў аб'яднанне.

Левы бок кожнай старонкі традыцыйна найбольш насычаны інфармацыяй аб розных рубрыках. Сайт „Вясны" — не выключэнне. Ніжэй пад своеасаблівай прэзентацыяй ідзе рубрыка „Навіны", якая падзяляецца на „Сёння" і „Архіў". Што тычыцца „Сёння", то ўсё выяўленне нічым не адрозніваецца ад выяўлення галоўнай старонкі. Апошнія паведамленні знаходзяцца ў цэнтры „карцінкі" і падаюцца анонсам. Каб даведацца аб падрабязнасцях, трэба націснуць адпаведныя стрэлачкі.

Калі казаць аб „Архіве", то тут крыху інакш. У сярэдзіне старонкі — інфармацыі папярэдняга месяца, а з правага боку — усе паведамленні, якія мелі месца аж з 1999 года. Прыемнае здзіўленне выклікае тое, што ўсе яны лёгка раскрываюцца і нішто не перашкаджае пазнаёміцца з падзеямі хай сабе недалёкіх, але ўсё ж мінулых гадоў.

Расчараванне з'яўляецца, калі націснеш на бягучы над навінамі радок у цэнтры сайта. Словы гавораць самі за сябе — забарона „Вясны".

Не ўсё, што хацелася б паглядзець у інтэрнэтнай „Вясне", удасца. Але гэта не значыць, што сайт не варты ўвагі. Ён у многім адлюстроўвае тую сітуацыю, якая існуе ў праваабарончай сістэме Беларусі — і там, і тут трэба яшчэ многа і настойліва працаваць.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Беларускія спартсмены ад Хельсінкі да Афінаў*

# Беларусь, беларусы...

**На зялёным кантыненце — I частка**
(2000, Сідней, 17 медалёў)

Алімпійскія гульні ў Аўстраліі выдаліся даволі паспяховымі для беларусаў. Усяго на далёкі астраўны кантынент прыбыло 140 спартоўцаў нашай краіны. У неафіцыйнай класіфікацыі паводле набраных ачкоў (яны налічваюцца за першыя восем месцаў у кожнай дысцыпліне) прадстаўнікі Беларусі занялі 16-е месца сярод 199 удзельнікаў. Па заваяваных медалях нашы суайчыннікі разам з венграмі падзялілі 15-ы радок турнірнай табліцы — усяго 17 узнагарод (па тры залатыя і срэбныя і адзінаццаць бронзавых). Дарэчы, Польшча з 14 медалямі размясцілася ўслед.

На вышэйшую прыступку п'едэстала ўзышлі **Кацярына Карстан** (Хадатовіч) — акадэмічнае веславанне, лодка-адзіночка; дыскаболка **Эліна Зверава** і штурхальніца ядра **Яніна Карольчык.** Срэбнымі медалямі былі ўганараваны **Ігар Басінскі** (кулявая стральба з адвольнага пісталета, адлегласць 50 м), **Юлія Раскіна** (мастацкая гімнастыка, асабісты турнір). Яшчэ адзін такі поспех выпаў на долю беларускай дружыны ў камандавым турніры па мастацкай гімнастыцы. У складзе выступалі **Таццяна Ананька, Таццяна Белан, Ганна Глазкова, Ірына Ільянкова, Марыя Лазук, Вольга Пужэвіч.**

Бронзавымі прызёрамі ў Сіднеі сталі **Ігар Басінскі** (пнеўматычны пісталет, адлегласць 10 м), дзюдаіст **Анатоль Ларукоў** (вагавая катэгорыя да 73 кг), штангісты **Сяргей Лаўрэнаў** (вагавая катэгорыя да 69 кг) і **Генадзь Аляшчук** (да 62 кг), стралкі **Сяргей Мартынаў** (адвольная вінтоўка, 50 м лежачы) і **Лаліта Яўглеўская** (спартыўны пісталет, 25 м), сяміборка **Наталля Сазановіч**, кідальнік молата **Ігар Астапковіч**, кідальніца дыска **Ірына Ятчанка** (дарэчы, жонка Астапковіча), барэц грэцка-рымскага стылю **Дзмітрый Дзябёлка** (супервагавая катэгорыя да 130 кг), **Павал Доўгаль** (пяцібор'е).

Заўважым, што Кацярына Карстан трэцюю алімпіяду запар трапіла на п'едэстал гонару, што сведчыць пра яе высокі клас. Сваё другое золата Кацярына заваявала неверагодным фінішным спуртам, толькі на адну сотую секунды апярэдзіўшы балгарку Нейкаву. Кідальніца дыска Эліна Зверава апярэдзіла срэбраную медалістку амаль на тры (!) метры. Вялікую пашану заслужылі беларускія гімнасткі-„мастачкі", якія набралі роўную суму балаў з расійскімі дзяўчынамі. Дзіўны, аднак, арбітраж падзяліў медалі несправядліва.

Ігар Басінскі стаў прызёрам трэці раз (сваю „калекцыю" ён пачаў збіраць яшчэ ў 1988 годзе ў Сеуле). Басінскі, шасціразовы чэмпіён свету, значны час жыў у Гродне, дзе нарадзіўся, а пасля пераехаў у Мінск. Гэты спартовец — „доўгажыхар" алімпіядаў. І няхай не здаецца, што кулявая стральба такі лёгкі від спорту. Падлічана, што за адну трэніроўку, якая доўжыцца 3-4 гадзіны, стралок падымае пісталет (ён важыць 1,3 кг) столькі разоў, што атрымліваецца ў суме звыш 300 кілаграмаў. Трэба дадаць, што медалёў у Басінскага магло быць і больш, але перад самай барселонскай алімпіядай 1992 года ў яго памёр бацька. У выніку гэтага знакаміты стралок, які быў у добрай форме, быў змушаны прапусціць чарговыя гульні. Асабістае жыццё Басінскага склалася ўдала. Ягонай жонкай стала Марына Амельянчык, даволі вядомая водналыжніца, рэкардсменка і чэмпіёнка Еўропы.

*Падрыхтаваў*
***Уладзімір Хільмановіч***

# *Занатоўкі кантрабандыста*

## Добры знаёмы

*Было гэта акурат перад Вялікаднем. Для кантрабандыста сама працоўны час. Кожны чалавечак хоча назапасіць алкаголю на свята, а попыт вызначае прапанову. Галоўны закон бізнесу! Вось і кінуліся ўсе са сваімі прапановамі ў Польшчу. Адна бяда — польскія мытныя службы таксама пра гэта ведаюць. Так пачалі трэсці бутлегераў, што алкаголь стала мажлівым перавезці толькі ў страўніку. Людзі, у якіх забралі тавар, былі ў роспачы і стане пошуку новых метадаў. Працоўныя няўдачы заўсёды актывізуюць мазгі. У такім працоўным пошуку я заспеў Аліка Гартанюка, беларуса з Беласточчыны, на гарадзенскім вакзале.*

*— Слухай мяне ўважліва, — пачаў ён так таямніча, нібы прапаноўваў мне стаць сябрам тайнай масонскай арганізацыі. — У мяне ўжо два разы запар сканфіскавалі тавар. Як так пойдзе далей, то застанемся без порткаў. Збанкрутуем зусім. Трэба штосьці мяняць. Лепш усяго знайсці добрага знаёмага ў польскіх службах, які будзе намі апекавацца. Я маю такога на воку. Шалёна любіць выпіць. Гэта адзіны чалавек у Беластоку, які можа мяне перапіць. Мы яго будзем паіць, а ён дапамагаць нам з перавозам спірту. Калі так пойдзе, то справы скочаць угару. Грошай будзе як у жыдоў. Ты мне вельмі патрэбны, бо ты беларус. Сваіх яны баяцца, думаюць падстава. А разам усё пойдзе гладка.*

*У цягніку ў Беласток, які народ ласкава называў спіртавозам, я па складзенаму сцэнарыю падышоў да памежніка і папрасіў яго хутчэй праверыць пашпарт. Маўляў, нічога не вязу, але вельмі спяшаюся. А тут, нібы выпадкова, падышоў Алік.*

*— Якая сустрэча! — радасна закрычаў ён. — Гэта ж трэба так. Сустрэў разам двух сваіх лепшых сяброў. Трэба нам гэта замачыць. Маю трошачкі спірту. Адмыслова важу для такіх выпадкаў.*

*Памежнік, як даведаўся, што ён лепшы сябра Аліка, трошкі здзівіўся. Але паведамленне пра спірт перакanала яго.*

*— Мне на працы піць нельга, — задумліва прашаптаў ён. — Пачакайце мяне ў Кузніцы. Як скончу працу, паедзем у Беласток разам. А зараз пасяджу з вамі, каб мытнікі не лезлі ў торбы.*

*Мытнікі, убачыўшы, што мы размаўляем з памежнікам, нават не падышлі да нас. Алік быў шчаслівы. На вакзале ў Кузніцы ён не змаўкаў. Тлумачыў, што калі мы сёння добра напоім Казіка (так звалі памежніка), то ўсе нашы праблемы скончацца адразу і назаўсёды. А як змена памежніка закончылася, мы паехалі разам у Беласток. Алік дастаў пляшку, проста з бутэлькі адпіў каля паловы і падаў яе Казіку.*

*— Ну ты і п'еш! — сказаў той і нагбом дапіў што засталося. Спытаўся толькі, чым можна закусіць.*

*— Якая закуска? — падміргнуў яму Гартанюк. — У нас толькі гарэлкі, што мы можам яе піць і ёй закусваць.*

*Пры гэтых словах ён раскрыў сваю торбу і паказаў што там ляжыць. Вочы ў памежніка бліскануЛі як ядзерны выбух. Ён моўчкі залез у торбу і дастаў кожнаму па пляшцы. На беластоцкі перон мы ледзве выпаўзлі. Шапка памежніка была чамусьці на галаве ў Аліка, а я цягнуў па зямлі за рукаво памежніцкую куртку. Куды мы ідзем, ніхто не ведаў, але неяк незразумелым чынам апынуліся ў Алікавай хаце. Пасля таго, як Гартанюк сказаў сваёй жонцы, што гэты памежнік цяпер будзе рабіць усё, што скажам, нават есці з нашых рук, яна маланкай паляцела збіраць на стол.*

*Прачнуўся я сярод ночы ад моцнага крыку. Нада мной у трусах і службовай шапцы стаяў Казік і патрабаваў пашпарт.*

*— У яго ад выпітага на халяву спірту пачаліся праблемы з мазгамі, — патлумачыў Алік. — Але ж упіўся, брыда! Думае, што ён на працы ў цягніку. Лазіць з пакоя ў пакой, як па вагонах, і патрабуе пашпарты. Ты яму хаця б далонь выцягні.*

*Я так і зрабіў. Казік ляпнуў па ёй кулаком, нібы паставіў пячатку ў пашпарце, і пасунуўся ў другія „вагоны". У кватэры ніхто не спаў. Памежнік хадзіў па пакоях і пляскаў кулаком па выцягнутых далонях, спраўна выконваючы свае працоўныя абавязкі. Не даваў прадыхнуць нікому: ні мне, ні Аліку, ні ягоным маленькім дзецям, якія ўвогуле яшчэ не дараслі да пашпартоў, ні яго старым бацькам, якія ўжо забыліся, што такое пашпарт. Дзеці плакалі, старыя пачалі маліцца, каб той памежнік здох. А той насіўся па „вагонах" як шалёны і патрабаваў паважаць законы перасячэння мяжы. Нарэшце хтосьці пачуў малітвы старых. Казік зачапіўся за крэсла, грымнуўся на зямлю і захроп. Усе астатнія, падзякаваўшы лёсу, таксама ўлегліся.*

*Раніцай я пабудзіў Аліка, каб ісці на рынак прадаваць спірт.*

*— Спі далей, — сумна адказаў той. — Няма аніякага спірту. Наш добры знаёмы выпіў увесь. Апошнія дзве бутэлькі забраў з сабой. Лепш бы гэты спірт у нас забралі на мяжы. Хоць галава не балела б. А як праспімся, падумаем наконт таго, каб знайсці якога-небудзь іншага знаёмага. З гэтым нічога не заробіш, каб яго халера забрала!*

**Сымон Нальшанскі**

# СЯМЕЙНЫ ЛЕКАР РАІЦЬ

Велікодныя святы гэта час сямейных спатканняў, калі ўрэшце спакойна, без стрэсу можам прысвяціць свой час блізкім. Шкада толькі, што ў нашай традыцыі выглядае гэта як марафон — ад стала да стала. У мамы — велікоднае снеданне, у цёткі — кава і не адзін кавалак пячэння, а ў цесцяў — абед, які незаўважна пераўтвараецца ў вячэру... Там кілішак гарэлкі, там бакал віна, а як цёпла то і куфаль піва... І так некалькі дзён! А што будзе марнавацца? Гэта ж свята! Быццам так, але ўва ўсім трэба захаваць меру, бо святочнае абжорства і п'янства могуць прывесці да непрыемных рэзультатаў. Што рабіць, калі спасцігне дрэннае самаадчуванне з-за пахмелля або разбаліцца жывот, раіць сямейны лекар **Барбара Пякарская**.

— Святы гэта не час на памяркоўнасць. Немагчыма, седзячы за сталом, адмовіцца ад прыемнасці скаштаваць усе стравы, хаця б нават і па кавалачку. Аднак часта нават не звяртаем увагі на колькасць спажыванай яды і трацім пачуццё меры. Найлепшым выхадам было б рабіць перапынкі ў час вандроўкі ад аднаго да другога стала. Я прапаную сямейныя шпацыры. Свежае паветра, крышку спорту — і чалавек адчувае сабе зусім інакш. Знікае пачуццё цяжкасці ў страўніку, робіцца лягчэй, нават на душы!

*— Велікодныя святы папярэджвае пост. Ці пасля такога перыяду, калі адмаўляемся ад мяса або іншых прадуктаў, можам адразу кінуцца на яду?*

— Пост прыдумалі разумныя людзі і карысталіся ім ужо ў старажытнасці. Цяпер пост набраў яшчэ большага значэння. Добра праведзены пост не то што не пашкодзіць, а яшчэ карысна паўплывае на цела і псіхіку. Посцячы, пазбываемся таксінаў з арганізма, які самадзейна правядзе рэгенерацыю, што відаць па валасах і скуры. Аднак да посту, дыеты ці галадоўкі трэба падрыхтавацца. Не можам так адразу, сказаўшы: ад заўтра пачынаю! На працягу некалькіх дзён трэба абмяжоўваць яду і толькі тады можам спакойна пасціць, без крыўды для здароўя. А пасля заканчэння посту абжорства не рэкамендуецца. Трэба памятаць, што святы хутка пройдуць, а вага будзе бязлітаснай!

*— Святы характэрны тым, што ўсё смакуе! А калі ўжо стане балець жывот або на другі дзень будзем пакутаваць з-за пахмелля, што тады?*

— Кожны мае свае спосабы так на абжорства, як і на пахмелле. На першае недамаганне раю выпіць зёлкі: запарыць цвет зверабою, а калі няма яго пад рукою — горкую гарбату. Хто меў дачыненне з пахмеллем, напэўна мае на яго свой спосаб! Большасць пакутуючых аддае перавагу соку ад кіслых агуркоў або капусты. Можа быць гарачы суп з квашанай капусты або з хлебнай закваскі. Некаторыя бяруць аспірын з вітамінам С. Я прапаную натуральную каву з імбірам і лімонам — можа дзіўным гэта здацца, але гавораць, што памагае! Я асабіста з нагоды Велікодных святаў жадаю ўсім чытачам „Нівы" моцнага здароўя і памяркоўнасці пры святочным стале, бо тады і пахмелле, і абжорства нас не спасцігнуць! Усяго найлепшага!

* * *

З абжорствам кожны сам можа справіцца. Але што зрабіць з пахмеллем? Адказ памаглі знайсці сябры. Спосабаў падказалі многа! Першы — не піць нашча, на пусты страўнік, і найперш з'есці гусінага тлушчу. Другі — сок ад квашаных агуркоў. Трэці — аспірын папіты моцнай кавай. Чацвёрты — прэпарат Alka Selzer папіты таматным сокам. Пяты спосаб спадабаўся ўсім — лячыцца тым, ад чаго захварэлі... Гэта ўсё жарты, бо вядома, што трэба захаваць памяркоўнасць! Бо якая тады будзе радасць ад святкаванняў, калі не будзем памятаць святочнага дня, а толькі пазнейшы боль галавы? Святкуйце здарова!

*Гутарыла Паўліна Шафран-Асташэвіч*

## *Сустрэча з Р. Раманюком*

*21 красавіка г.г. у Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы (вул. 3 Мая, 45) адбудзецца аўтарская сустрэча з* ***Радаславам РАМАНЮКОМ****, аўтарам кніжкі „Рэлігійная драма Талстога". Р. Раманюк пражывае ў Арэшкаве каля Гайнаўкі. Зараз піша доктарскую дысертацыю на Варшаўскім універсітэце. Пачатак сустрэчы ў 17 гадзін.*

***(яц)***

*Сям'і і блізкім словы шчырага спачування*
*з прычыны смерці МАРЫІ АНДРАЮК-ЖАК*
*выказваюць пацыенты, суседзі і сябры*

*Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, адкрываем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).*

## ШУКАЮ ПРАЦУ

• Студэнтка шукае працу ў Беластоку, правы кат. B, добрае веданне англійскай мовы, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602 769 109.

• Жанчына (49 гадоў), без дрэнных прывычак, салідная, прыбярэ кватэру, бюро, заапякуецца дзіцём, тэл. 651 72 50.

• Маладая жанчына патрабуе неадкладна працы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 664 03 61.

• Аператыўны, без дрэнных прывычак шукае працу ў Беластоку, веданне нямецкай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, правы кат. B і ахвота працаваць, тэл. 0608 210 435.

• Шафёр з уласнай грузавой машынай тэрмінова патрабуе працы, тэл. 0692 281 804.

• Жанчына-пенсіянерка танна і дакладна прыбярэ кватэру, зварыць (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0606 665 980.

• Малады, вопытны бармен шукае працу па уік-эндах у Беластоку, кніжка здароўя, санітарны мінімум (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602 318 086.

• Ахвотна заапякуюся малым дзіцём, тэл. 0508 820 414.

• Абітурыентка рускай філалогіі шукае працу ў Беластоку, правы кат. B, добрае веданне англійскай мовы, закончаныя камп'ютэрныя курсы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 732 60 27.

• Медсястра з 24-гадовым вопытам заапякуецца хворай асобай, тэл. 0501 527 088.

• Малады сталяр шукае працу, уласная машына, тэл. 743 19 57.

• Маладая жанчына (27 гадоў) тэрмінова шукае працу, вопыт у гандлі (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0508 753 167.

• Студэнтка інфарматыкі шукае часовую працу, добрае веданне нямецкай мовы, правы кат. B, уласная машына (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0692 204 020.

• Краўчыха з практыкай шукае працу ў Бельску, тэл. 0502 370 486.

• Малады механік, тэхнічная адукацыя, двухгадовы вопыт у майстэрні, тэл. 0692 438 475.

• Жанчына, 42 гады, вопыт у гандлі і гастраноміі, шукае часовую працу ў Бельску-Падляшскім, тэл. 730 63 16.

• Вышэйшая адукацыя, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы, сумленны, шукае працу, тэл. 0693 075 252.

• 24 гады, вышэйшая эканамічная адукацыя, правы кат. B, кніжка здароўя, фіскальная каса (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0506 489 040.

• Жанчына шукае працу ў гандлі, вопыт, правы кат. B, тэл. 0505 617 399.

## *Дапамагаем сабе ўзаемна*

**У Бельску: 730 20 06**

• Сям'я будзе ўдзячна за адзенне для сыноў ва ўзросце 5 і 6 гадоў.

• Сям'я патрабуе мэблі, пасцелі і адзення для траіх дзяцей ва ўзросце 4, 7, 9 гадоў.

• Сям'я, якая выхоўвае пяцёра дзяцей, будзе ўдзячная за дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

• Самотная маці з хворым сынам ва ўзросце 12 гадоў будзе ўдзячна за ўсякую помач пры закупе лякарстваў, галоўная патрэба — інвалідная каляска.

• Самотная 66-гадовая жанчына патрабуе дроў, вугалю, цёплай пасцелі і грошай на лякарствы.

**У Беластоку:**
**732 01 86; 712 11 53**

• Самотная маці з дума сынамі ва ўзросце 10 і 13 гадоў, якая пасля смерці мужа апынулася ў трагічным становішчы, прыме любую дапамогу дзеля стварэння нармальных умоў існавання, прыдасца старая мэбля, халадзільнік, тэлевізар.

• Сям'я без сродкаў да жыцця патрабуе адзення і абутку для дзяцей, а таксама пасцелі.

• Старэйшыя, хворыя людзі патрабуюць асобы, якая бясплатна дапаможа ў хатніх працах.

• Адзінокая маці, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і для 15-гадовай дачкі, а таксама пледаў і пасцелі.

• Шасціасабовая сям'я, без сродкаў да жыцця, патрабуе пасцелі, цёплага адзення і абутку для дзяцей.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

• Аддам тапчан-полку з шафай, тэл. 651 80 20.

***Сабрала***
***Паўліна Шафран-Асташэвіч***

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 600 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (0 10xx 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2004 r. upływa 5 czerwca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

## *Народныя пагаворкі ў рыфмоўцы В. Шведа*

*Замнога гаворым — язык наш вораг.*

* * *

*Еж пірог з грыбамі, ды трымай язык за зубамі.*

* * *

*Хлеб-соль еж, а праўду рэж.*

* * *

*Маўчанне заўсёды знакам згоды.*

* * *

*Часам з квасам, парою з вадою.*

* * *

*Месца святое не бывае пустое.*

* * *

*Не вер вушам, а вер вачам.*

* * *

*Насілу не будзеш мілы.*

* * *

*Стары — як з дзіцячай пары.*

* * *

*Стары друг лепшы за новых двух.*

* * *

*Ад сотні рублёў лепшая сотня сяброў.*

* * *

*Разумная галава знайшлася, ды дурному дасталася.*

* * *

*Дурнога вучыць — як мёртвага лячыць.*

* * *

*Раней смерці не ўмерці.*

* * *

*Двух смярцей не бывае, а адна не мінае.*

* * *

*І на пагосце бываюць госці.*

* * *

*Пасмяешся з чужой бяды — свая надыдзе тады.*

* * *

*З ваўкамі жыць — па-воўчы выць.*

* * *

*Не ведаеш, мой любы, дзе знойдзеш, а дзе згубіш.*

* * *

*Ажэніцца — пераменіцца.*

* * *

*Хто думае тры дні, той выбірае злыдні.*

* * *

*Рыба шукае дзе глыбей, а чалавек — дзе лягчэй.*

* * *

*Прыгажосць да вянца, а розум да канца.*

* * *

*Як да вянца, так і да канца.*

* * *

*Дзявочы стыд да парога, а пераступіла — аб усім забыла.*

* * *

*Не знайшоўшы броду — не лезь у воду.*

* * *

*Людзі ідуць араць, а мы рукамі махаць.*

* * *

*У сытае бруха хоць бі абухам.*

* * *

*Курка па зярняці клюе жыта, ды бывае сыта.*

* * *

*Не бойся сабакі які лае, а які маўчыць і хвастом віляе.*

* * *

*Пісаў пісака, а імя яму сабака.*

* * *

*Не ўсяму золатам быць, што блішчыць.*

* * *

*Закон як дышла: куды павернеш, туды і выйшла.*

* * *

*Ваду таўчы — вада будзе цячы.*

# Вялікадні да 2020 г.

| Гады | Пачатак Вялікага Посту | ВЯЛІКДЗЕНЬ (ПАСХА) | | Узнясенне Гасподняе (Ушэсце) | Тройца (Пяцідзесятніца) |
|---|---|---|---|---|---|
| | праваслаўны | каталіцкі | праваслаўны | праваслаўнае | праваслаўная |
| усе даты па новым стылі | | | | | |
| **2004** | 22.02 | 11.04 | **11.04** | 20.05 | 30.05 |
| **2005** | 13.03 | 27.03 | **01.05** | 09.06 | 19.06 |
| **2006** | 05.03 | 16.04 | **23.04** | 01.06 | 11.06 |
| **2007** | 18.02 | 08.04 | **08.04** | 17.05 | 27.05 |
| **2008** | 09.03 | 23.03 | **27.04** | 05.06 | 15.06 |
| **2009** | 01.03 | 12.04 | **19.04** | 28.05 | 07.06 |
| **2010** | 14.02 | 04.04 | **04.04** | 13.05 | 23.06 |
| **2011** | 06.03 | 24.04 | **24.04** | 02.06 | 12.06 |
| **2012** | 26.02 | 08.04 | **15.04** | 24.05 | 03.06 |
| **2013** | 17.03 | 31.03 | **05.05** | 13.06 | 23.06 |
| **2014** | 02.03 | 20.04 | **20.04** | 29.05 | 08.06 |
| **2015** | 22.02 | 05.04 | **12.04** | 21.05 | 31.05 |
| **2016** | 13.03 | 27.03 | **01.05** | 09.06 | 19.06 |
| **2017** | 26.02 | 16.04 | **16.04** | 25.05 | 04.06 |
| **2018** | 18.02 | 01.04 | **08.04** | 17.05 | 27.05 |
| **2019** | 10.03 | 21.04 | **28.04** | 06.06 | 16.06 |
| **2020** | 01.03 | 12.04 | **19.04** | 28.05 | 07.06 |

## „Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

— Што робіць халасцяк, калі вечарам вяртаецца дадому?

— Заглядае ў халадзільнік і калі нічога цікавага там не знойдзе, кладзецца ў ложак.

— А што ў такіх абставінах робіць жанаты?

— Заглядае ў ложак, а калі нічога цікавага там не знаходзіць, ідзе да халадзільніка.

* * *

Гутараць дзве пенсіянеркі:

— Скажы мне, як жыць з такой малой пенсіяй пры такіх высокіх цэнах?

— Коратка.

* * *

Злосны дзедка дакарае ўнучку:

— Вы, сучасныя дзяўчаты, апранаеце на вуліцу менш, чым вашы бабулі ў ложак!

* * *

Дзедка доўга і красамоўна расказвае ўнуку пра свае прыгоды ў час вайны.

— Спадзяюся, што ты ўсё зразумеў, — упэўніваецца пасля заканчэння ў унука.

— У прынцыпе так. Толькі адна-го не магу ўцяміць: навошта, апрача дзедка, былі на вайне патрэбны апошнія салдаты?

* * *

Топіцца параход. Няма выратавальных шлюпак, усе ў роспачы ад страху перад смерцю. Толькі капітан з каменным тварам курыць люльку. Падбягае да яго прыгожая жанчына:

— Захапляюся такімі мужчынамі як вы. Мы неўзабаве сканаем у вадзе, а вы паводзіце сябе халоднакроўна, як герой!.. Маю да вас просьбу: зрабіце нешта, каб я раз у жыцці адчула сябе сапраўднай жанчынай!

Капітан скідае мундзір і кашулю і загадвае:

— Мундзір выпрасуй, а кашулю вымый!

* * *

Кандуктар звяртае пасажырцы ўвагу, што мае білет у Бельск, а едзе ў Беласток.

— Ну і бачыце, — адказвае тая, — машыніст паблытаў пуці.

# *Адгаданка*

## *Наша свята вясны*

(трайная анаграма)

*Вялікі пост у _ _ _ _ _ _ _ _ важна ўвайшоў:*
*Асётрава _ _ _ _ і хлебны _ _ _ _ ілюмінуюць стол.*
*Але ідзе адмена: за яйкамі хлеб, соль _ / _ _ _ _ _ _ _ _,*
*Каўбаска, кумпячок і родненькая чарка.*

**(ш)**

Рашэннем адгаданкі з'яўляюцца тры словазлучэнні з аднолькавых, але па-рознаму ўпарадкаваных літар (па восем).

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 9 нумара**

Баба, бура, дача, дыба, зайздасць, конь, Кубань, пах, печ, смецце, цана, цар, цуд, цытата.

Рашэнне: **Дурнота пхаецца наперад каб быць бачнай, мудрасць астаецца ззаду каб бачыць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

# 11.04 – 17.04

**Баран (21.03. — 19.04.)** Трыгон Марса да Нептуна прачуліць тваю інтуіцыю. Ніхто цябе не зможа ашукаць. Прыемныя сустрэчы. Не рабі задання абы-як. Больш еш, менш пі.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Можа, не ўсё ў вашых адносінах ясна выражана? Калі нейкае знаёмства цябе абцяжарвае, спрабуй адысціся ды паслабіць сувязь. Насі свабаднейшы абутак.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Энергія ды аптымізм будуць цябе аж распіраць. Падабаешся. У сувязі з інтарэсамі можаш крыху жыць не ў сваім доме. Важныя сустрэчы і супольныя планы з сябрамі.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Ракі народжаныя паміж 17 і 20 ліпеня могуць перажываць востры крызіс. Займаць цябе будуць розныя формы ашчаднасці і памнажэння капіталу. Можаш падумаць нават аб куплі кватэры ці зямлі. Спрабуй пахудзець, але не прымяняй надта строгай дыеты.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Добры час на павышэнне кваліфікацый, экзамены. Варта выбрацца за мяжу. Святы 11.04., дзякуючы трыгону Сонца да Плутона, глыбока застануцца ў памяці. Гарманічная партнёрская сувязь будзе патрабаваць большай увагі.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Канфлікты і прыкрыя непаразуменні, асабліва з дзецьмі. Вораг кожнага сужонства — нуда! Ахвота памяняць жыллё на большае ці зрабіць рамонт. Шмат энергіі ўкладзеш у рэалізацыю сваіх амбіцый. Сцеражыся інтрыг, не плянтуй на кіраўніцтва. Мабыць, спатрэбяцца табе акуляры.

**Шалі (23.09. — 23.10.)** Пачнеш на свет глядзець праз прызму новай жыццёвай філасофіі. Хтосьці захоча цябе здамінаваць, але дыпламатычна не дайся. Больш аптымізму на працы, энтузіязм і ўпэўненасць. Пазбягай алкаголю і тлушчаў (раслінных таксама), еш цытрусы.

**Скарпіён (24.10. — 21.11.)** Твае стаанні падтрымае стваряаючыся 11.04. трыгон Плутона з Сонцам, які пабудзае ўзрушэнне і давядзе да таго, што знойдзеш развязку ўсіх праблем. У планах будзь асцярожны, можаш мець поспех, але крочыш па крохкім лёдзе. Скарпіёны з другой дэкады не знойдуць падтрымкі ў блізкай сям'і (хутчэй разлічвайце на далейшых сваякоў). Пазбягай ляноты і задоўгага сну; хадзі спаць раней.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Празмерная ўпэўненасць, якую будзе дыктаваць табе квадратура Венеры з Юпітэрам (13 — 15.04.) можа стаць прычынай нечаканых клопатаў. Ад віру падзей закружыцца табе ў галаве. Можаш шмат здзейсніць, але не пазбегнеш канфліктаў з атачэннем. Цяжка будзе табе пахудзець, бо будзеш мець вялікую ахвоту сабе дагадзіць.

**Казярог (22.12. — 20.01.)** Будзеш мець нагоду да творчых дзеянняў, калі прабываючы ў тваім знаку Хірон створыць трыгон з планетоідам Паладай. Паміж 15 і 18.04. задзівяць цябе вынікі пазітыўнага мыслення і афірмацыі. 16 — 20.04. не едзь у падарожжа, пазбягай рызыкоўных сітуацый.

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** Больш рамантызму і пачуцця на штодзень. Раз на возе, раз пад возам. Не вер вушам, а вер вачам. Усміхайся — лёс усміхаецца тым, хто ўсміхаецца яму. У дыеце можаш дазволіць сабе нават на шаленствы, з перчыкам.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** 13.04. Нептун стварае секстыль да Сонца, ад чаго ўзрасце твая баявітасць. Усе Рыбы адчуюць, што іх кахаюць. Можаш знайсці добрую працу, але не ў сваёй прафесіі.

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960

# Ніва Валачобная



Фота са збораў Музея Малой Айчыны ў Студзіводах

*Віктар Швед*

## *Благавешчанне*

*Прыродны свет ужо прачнуўся*
*З зімовага даўгога сну.*
*Зноў з выраю вярнуўся бусел*
*І абвяшчае нам вясну.*
*Зямная радуйся планета!*
*Вяшчанне Божае з нябёс*
*Марыі Дзеве з Назарэта*
*Архангел Гаўрыіл прынёс.*
*Ад Бога гэтая павіннасць,*
*Воля Марыі, не прымус.*
*Пачне Яна й народзіць Сына,*
*І імя дасць яму Ісус.*
*У Благавешчанскае Свята*
*Люд хрысціянскі верыць стаў*
*У збаўлення нашага пачатак,*
*Ва ўвасаблення дзень Хрыста.*

# Называлі мяне мазуркай

Нарадзілася я ў Любліне, а пасля з маці, што за айчымам паехала, апынулася ў пэгээры за Кашалінам. І там я пазнаёмілася са сваім Косцем. Ягоны бацька не пусціў яго ў школу, то ён у пэгээр з калегамі выехаў, каб зарабіць крыху грошай. Але бацька зараз стаў хварэць і Косцю ліст праслаў, каб вяртаўся. Косця напісаў, што мае дзяўчыну, а бацька адпісаў, каб прывозіў калі падабаецца. Мне тады было шаснаццаць гадоў, а яму на год больш.

І я паехала за Косцем, бо ад айчыма ўцякала, які біў і маму, і мяне. Была я яшчэ да таго часу год у аднаго доктара ў Кашаліне, служанкаю працавала, то калі толькі ён плаціў мне грошы, тады маці прыязджала і забірала іх ад мяне на айчымавых дзяцей. А мне ставалася толькі тое, што гаспадары мяне карміпі і часам мне нешта купілі. І не было мне нават як вучыцца, хаця я хутка засвойвала веды.

Едзем мы поездам ад Гайнаўкі. Я ўпершыню ў жыцці ўбачыла жалязняк, дык амаль ад яго віду ад смеху не спухла. Са станцыі ішлі мы з дзвюма Косцевымі суседкамі. Дождж тады такі прыпусціўся, што свету не было відаць. І ў лесе я папрасіла, каб спыніцца, бо мела на сабе белыя шкарпэткі, якіх не хацела пабрудзіць у гразі; каля Кашаліна ўсе дарогі былі асфальтавыя, абсаджаныя каштанамі. Скінула я абутак, узяла ў рукі і далей басанож пайшла; адна з нашых спадарожніц таксама басанож ішла.

Прыходзім пад хату, а я ж *ni mowy, ni głowy*! Косцева маці ў хаце ў драўнянай балеі нешта мыла, рукамі церла; пазней я тару ў Гайнаўцы купіла, дык цэлая вёска дзівавалася гэтай вынаходцы. Бацькі дома не было, быў з каровамі на пашы. Я стаю ў ліўні, а Косця ў акно пастукаў:

— Мамо, прыехалі!

Маці выцерла рукі, выйшла, прыняла ў хату. Зараз скварак на патэльню кінула, яек разбіла, чорны хлеб на стол нарэзала, наліла кампот…

Суседкі зараз даведаліся, што Косця *вазе нівеі́стку* і адна з іх пад акно з'явілася. Што маці гаварыла, я крыху кеміла, але што суседка, не магла тады разабрацца:

— Нябрыдкае дзіця, але гаўно маладое, — сказала пра мяне.

Я тады важыла адно сорак восем кілаграмаў і калі Косця патлумачыў змест сказанага, я рашыла вяртацца адсюль. Але Косця не пусціў:

— Ja ciebie przywiozłem i nigdzie nie puszczę! — сказаў.

Ну і я асталася. Прыехалі мы за тыдзень да *Пятра* і яшчэ да свята я ўжо пайшла лён палоць. На *Пятра* Косця кажа мне:

— Да клуні пойдзем спаць.

— Do koni? Ja nie pójdę! — злякалася я. Пасля яшчэ пачула, што клуню гумном называюць, дык таксама нямала збянтэжылася.

Мясцовую мову авалодала я на працягу года, бо ж лёгка мне яна засвойвалася, ды і нагод было многа яе чуць: зараз у адведкі цешча стала мяне адпраўляць, і на вячоркі прасці, і лён церці на церніцах каля ямаў.

Называлі мяне часам мазуркай, але адносіліся вельмі добра. Толькі з цешчай не заўсёды ладзілася, але былі дзве суседкі, што вельмі за мяне стаялі…



Фота Аляксандра Вярбіцкага

*Ядвіга Самоцік*

Мінула так некалькі маіх гадоў і ў вёску прыехала адна старэйшая пані з Сямятыч кола вясковых гаспадынь арганізаваць. У першы раз паказала яна нам у адной гаспадыні, як цяляціну апрацоўваць. У другі раз у іншай гаспадыні паказала, што рабіць са свінінай — вялікая гасціна тады была. Ды яшчэ раз нечага вучылі, і ўсё!

Спярша кіраваць тым колам абралі Эму, а праз некалькі гадоў мяне; пасля мяне гэтым занялася Люба. Але сходы не ладзіліся, бо або не хацелася на іх хадзіць, або часу не было. Прыязджалі да мяне агітаваць, каб арганізаваць курсы вышывання, але ў мяне тады ўжо шмат дзяцей было ды многа работы ў полі, і так бывала, што спала я па дзве гадзіны ў суткі. Як тады яшчэ займацца нейкімі курсамі? І калі я адмаўлялася, то і іншыя жанчыны таксама адмаўляліся.

Сабралі, аднак, складчыны і купілі пральку „Frania" ды набор настольнага сервізу. Тая пралька стаяла ў аднае толькі гаспадыні і яна яе свайму хросніку аддала ў падарак. А супольная пасуда захоўваецца да сёння і калі каму трэба на веселле ці хаўтуры, тады пазычае яе; калі хто што пашкодзіць — кампенсуе страту.

Усюды мяне запрашалі нашы вясковыя жанчыны і я хілілася да іх. Мясцовыя песні вельмі я палюбіла, ахвотна іх завучвала. І цяпер спяваю на хаўтурах. Нядаўна ў Нарве праводзілі мы аднаго пакойніка, то Алёша, што ў Гайнаўцы жыве, хваліў мяне, што вельмі добра там спявалі.

Не мела я дзяцінства, не маю і старасці. Пахавала я сына, а цяпер зяця. І як пару гадоў назад ураган праз вёску прайшоў, то дрэва на старую і новую нашы хаты звалілася. А ў мінулым годзе вельмі падвялі нас дачка з зяцем — выехалі невядома куды, пакідаючы трое школьных дзяцей на нашы галовы; і не ведаем, ці гэта нейкая кара Косцю, ці мне. Галава не хоча ўмяшчаць такога гора!.. Суседзі спагадваюць нам: хто вопратку прынясе, хто нават ежу… Гавораць: як з яйца, так да канца.

**Запісаў Аляксандр Вярбіцкі**



**Мал. Алега Карповіча**

*Цяжкае матэрыяльнае становішча многіх сем'яў выклікае „ўцёкі" ў алкаголь, якія становяцца „спосабам выжывання". На вёсках астаюцца старыя людзі і мужчыны ў вытворчым узросце, але без жыццёвых перспектываў — адсюль пападанне ў алкагалізм...*

# Вялікае беспрацоўе ў Арлянскай гміне



У Арлянскай гміне ў канцы мінулага года пражывала 3 698 асоб, у тым ліку 978 у самой Орлі. Скарачаецца лік жыхароў гміны, але расце... беспрацоўе. Яно ўжо ад нейкага часу найбольшае ў Бельскім павеце і ўсё буйнее (у Павятовай управе працы зарэгістравана каля трохсот беспрацоўных з Арлянскай гміны). Беспрацоўе ахоплівае галоўным чынам людзей з асноўнай прафесіянальнай адукацыяй ды пачатковай і незавершанай пачатковай, людзей з найкарацейшым працоўным стажам (да пяці гадоў), галоўным чынам маладых жанчын (18-34) і мужчын (25-54 гадоў). Існуе і скрытае беспрацоўе, бо частка працанеўладкаваных людзей не рэгіструецца.

Паводле агульнага сельскагаспадарчага перапісу ад 1996 года, з працы на сваёй гаспадарцы ўтрымоўвалася ў Арлянскай гміне 899 асоб ва ўзросце за 15 гадоў. 234 асобы працавалі па-за аднаасобніцкімі гаспадаркамі, з чаго каля 60% у паслугах.

Да часу трансфармацыі сама Орля лічылася прамысловым пасёлкам, дзе ў некалькіх меншых і большых прадпрыемствах працавала каля тысячы асоб. Прычынай ліквідацыі некаторых прадпрыемстваў была нястача сыравіны для вытворчасці, адсутнасць попыту на іх вырабы і няякасны менеджмент.

Да 1974 года працавала цагельня, дзе выраблялі з добрай мясцовай гліны якасную цэглу. У 1994 годзе рашэннем Управы гміны была ліквідавана самаўрадавая ветэрынарная лячэбніца. Да 1995 года працавала кафлярня (пасляжыдоўская, звыш стогадовая, разбудаваная пасля вайны), якая выраблял кафлю і дробныя керамічныя вырабы (для лампадак). Пад канец 1990 года закрыты быў мяжуючы з кафлярняй бетоназавод, які пастаўляў не толькі пустакі, але і дарожныя брускі, вадзяныя пропускі, падваконнікі, намагільныя пліты і т.п. У той час ліквідавалася ўправа дарог, неўзабаве распаўся эскаэр, а з ім некалькі свінафермаў (у Шчытах, Дыдулях, Вульцы-Выганоўскай). Астаўся толькі гээс, але і ён ледзь дыхае, бо даўно ўжо ліквідаваўся мясцовы мясакамбінат, паслуговая майстэрня, некалькі крамаў і карчма, а млын здадзены быў у арэнду.

Цяпер на тэрыторыі гміны няма прамысловасці. Дзейнічаюць толькі паслугі, гандаль, невялікія прыватныя майстэрні, некалькі ўстаноў, дзе ўсяго працуе каля трохсот асоб. На працу ў Бельск даязджаюць нямногалікія. Некаторыя займаюцца саматужніцтвам, частка толькі сезонна.

Ад нейкага часу невялікая група мужчын наймаецца на працу ў наваколлі Варшавы, найчасцей сезонна, пры пабудове драўляных дач і іх аддзелцы ды пры іншых будаўнічых працах. Цікавае тут тое, што працадаўцамі з'яўляюцца найчасцей выхадцы з Арлянскай гміны і наваколля. Людзі, якія такім чынам наймаюцца на працу, бачаць у гэтым і плюсы, і заганы. Наракаюць яны, галоўным чынам, на заробкі, якія, па-сучаснаму, атрымоўваюць штотыдзень. Субяседнікі не хацелі замнога пра гэта гаварыць, бо будучы далёка ад дома грошы расходуюцца хутка. Яны зарабляюць намнога менш, чым рабочыя з наваколля Варшавы. Справа ў гадзінных тарыфах, якія ў цэнтры краіны большыя. Хлопцы з вёскі з'яўляюцца таннай рабочай сілай, бо хаця працуюць пад Варшавай, але паводле беластоцкіх тарыфаў, напр. за 5 злотаў за гадзіну, калі варшавякі зарабляюць па 9-11 злотаў; калі хочаш працаваць — працуй. Некаторыя астаюцца там, а некаторыя вяртаюцца, бо, як кажуць, лепш ужо збіраць камяні каля Орлі па 4 злоты за гадзіну — прынамсі не трэба думаць, як у час спецыялістычных работ (тынкаванне, пракладка керамічных плітак) за 5 злотаў.



Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Вырабы з бярозавага хворасту ў фірме „Orlas"

Старэйшыя людзі ўсё яшчэ прыгадваюць, як у 1960-70-х гадах дадатковым сродкам паправы сялянскай долі было выплятанне саламяных каробак. Дзякуючы гэтаму ў некаторых вёсках, напр. у Рудутах, людзі пабудавалі новыя дамы, а ў іншых, напр. у Міклашах, за заробленыя такім чынам грошы пакідалі саламяныя стрэхі і замянілі іх чарапіцай. У Кошках і Градалях сяляне выраблялі саламяныя маты. Пасля гэтыя вырабы „Цэпэлія" перастала купляць.

Мінулі гады і ў 1996 годзе паявіўся ў Орлі новы шанс, каб у сваіх хатах падзарабіць крыху грошай. Гэты шанс стварае Вытворча-гандлёвае прадпрыемства „Orlas", якое добраўпарадкавала пустуючы склад гээсу і занялося арганізацыяй вытворчасці, скупкай і экспартам дэкаратыўных і прыкладных вырабаў з бярозавага хворасту, ракіты, ляшчыны, драўняных адкідаў, саломы, сена ды лляснога руна. Гэтай вытворчасцю займаюцца нярэдка цэлыя сем'і — не толькі беспрацоўныя, але і малазямельныя сяляне. Іншыя такую ж вытворчасць з саломы ці бярозы прадаюць другім пасрэднікам.

У апошні час і сюды завіталі змены: ад года такую дзейнасць трэба ўжо зарэгістраваць. Арлянская фірма сама паклапацілася пра сваіх пастаўшчыкоў, а вось іншыя вытворцы былі вымушаны адмовіцца ад далейшай дзейнасці з той прычыны, што аплата рэгістрацыі паглынула б палову іх выручкі.

Слабее і мясцовы гандаль. Недзе ад года прадуктовыя крамы значна абмежавалі продаж напавер асобам, якім не хапае грошай. Прадаўшчыцы тлумачаць гэта тым, што і ім не хапае грошай на куплю тавару. Такіх пакупнікоў было, відаць, нямала, бо цяпер на арлянскім рынку нямнога іх круціцца, а калісь быў рух. Многія людзі не ідуць і да лекара, бо не маюць грошай выкупіць рэцэпт.

Зарэгістраваныя беспрацоўныя могуць звяртацца ў Гмінны асяродак сацыяльнай дапамогі. Патрабуючых многа і гэтая ўстанова не заўсёды ў змозе дапамагчы кожнаму, бо не хапае сродкаў. Выплаты вельмі сціплых засілкаў часта адбываюцца са спазненнем. Расце і лік асоб, якія кваліфікуюцца да пастаяннага засілку, г.зн. дапенсійных рэнт па нездароўю.

Беспрацоўе спараджае новыя праблемы. Цяжкае матэрыяльнае становішча многіх сем'яў выклікае „ўцёкі" ў алкаголь, якія становяцца „спосабам выжывання". На вёсках астаюцца старыя людзі і мужчыны ў вытворчым узросце, але без жыццёвых перспектываў — адсюль пападанне ў алкагалізм. Паводле даных Комплексу аховы здароўя ў Орлі каля 10% насельніцтва гміны (8% мужчын і 2% жанчын) маюць клопат са здароўем выкліканы празмерным спажываннем алкаголю.

На пытанне „Як жывецца?" людзі часта адказваюць іранічна „Лепш... не пытай". Жывецца штораз горш і людзі аднадушна прарочаць, што будзе яшчэ горш. Мала каторы беспрацоўны разлічвае на лепшае; маладыя пераляканыя перспектывай, а старэйшыя прымірыліся ўжо з бядой і апатыяй.

Перасталі наракаць і пенсіянеры. Мабыць таму, што бачаць, што іншыя не маюць нават таго, што яны маюць і часта іх пенсіі з'яўляюцца крыніцай выжывання цэлай сям'і ці нават гаспадаркі.

У Польшчы зарэгістравана звыш 3 мільёны беспрацоўных, а разам са скрытымі беспрацоўнымі іх больш за 5 мільёнаў. Пенсіянераў яшчэ больш.

**Міхал Мінцэвіч**

*Сцяпан Карбоўскі з Чахоў-Забалотных апісваў сваё...*

# Праз сорак гадоў

Ад 1964 года не бачыліся. На фэсце Віктар Швед падпісаў сваю кнігу Сцяпану Карбоўскаму: „Даўно не бачанаму сябру...”

— Ён мяне не пазнаў. А ў мяне памяць добрая, здаровая. Памятаю перш за ўсё твары. А разам жа ж працавалі ў ГП — ён быў інструктарам у Варшаўскім аддзеле, а я — на Бельскі...

Сустракаю Сцяпана Карбоўскага марозным ранкам у Гайнаўцы, у ягоным доме па вуліцы Варшаўскай, доме, пабудаваным яшчэ жончыным дзядзькам, даваенным чыгуначнікам. Вядома, дом той — пасучаснены, з выгадамі, з варштатам побач, а Сцяпан сама вярнуўся з Дабрывады; зрання ездзіў на Ніліну радзіму, каб аформіць справу з сенам. Пакуль гаспадарылі і там, засталася поўная пуня, і камусь тое спатрэбілася, дык аддалі. І там, у Дабрывадзе, Сцяпан меў інтарэсы. А цяпер ён — не зусім паспакайнеў, хоць пенсіянер ужо.

Давялося мне шукаць Сцяпана Карбоўскага як аўтара апавяданняў надрукаваных у „Ніве” сорак гадоў таму, а адно з якіх увайшло ў зборнік найлепшай тутэйшай прозы за апошнія паўстагоддзе — *Панароўе*. Ніхто не ведаў, дзе цяпер паказваючы талент аўтар, які змоўк пасля выдатнага дэбюту.




*Сцяпан Карбоўскі з унучкамі Магдай, Габрысяй і Галенкай*



## Як стаў жыць

— Вось, і ўсё тое я прыгадаў... Гэта быў 1962, 1963, 1964 год... Кожную апошнюю суботу месяца інструктары сустракаліся ў сядзібе ГП па Варшаўскай, 11, у Беластоку. Арганізаваў я Шведу таксама аўтарскія сустрэчы па Бельскім павеце.

Беларусаў Карбоўскіх няшмат. Усе, дарэчы, радня. Гэта загінулы ў пажары ад выбуху газу ў Чахах-Забалотных брат Сцяпана, другі ў Гайнаўцы — памерлы ўжо брат-пажарнік і Сцяпанавых двух сыноў. Так што трапіць на след былога ніўскага аўтара няцяжка.

Сцяпан вучыўся ў Бельскім белліцэі, разам з Янкам Чыквіным з Дубіч-Царкоўных у адным класе. Пасля смерці бацькі матуля не магла памагаць сыну, заплаціць за кватэру і вугаль у Бельску, і ён быў вымушаны кінуць школу і перайсці ў карэспандэнцыйны ліцэй. А вучыўся ў белліцэі вельмі добра, меў нават маленькую стыпендыю... Ну, што ж, пасля рабіў чыгуначнікам у Сілезіі, шахцёрам (адпрацоўваў армію). Пасля працы ў ГП, калі паменшалі датацыі, занепала багатая праца (была развязана м.інш. „Лявоніха” і распусцілі большасць інструктараў), быў кіраўніком добраахвотнага атрада (ОНР) ў Голдапе. Вярнуўшыся на Бельшчыну стаў працаваць у фінансавым аддзеле ў Бельску. Пасля рээарганізацыі („Władza bliżej ludu”) перакінулі яго ў Нурэц каля Боцькаў; адтуль ён даязджаў у Чахі, памагаць матулі ў гаспадарцы... Усе даты, як і твары напатканых людзей, у ягонай памяці: да 3 ліпеня 1967 г. (у лютым 1967 г. ажаніўся з Нінай); з 1 верасня 1967 г. перасяліўся ў Гайнаўку, стаў дыспетчарам транспарту ў камунальнай гаспадарцы. У 1979 г. прайшоў на „ўласную ініцыятыву”. Стаў рабіць помнікі. І рабіў іх аж да пераваротаў „дэфармацыі сацыялізму”. У 1995 годзе перайшоў на пенсію.

— І цяпер я „эмерыта”. Хату паставілі старэйшаму сыну, малодшаму — купілі ферму курэй-бройлераў, 3 кіламетры ад Гайнаўкі. І памагаем — то аднаму, то другому. Памагалі і Ніліным бацькам у Дабрывадзе, пакуль цесці жылі. Цяпер вядома, якія эканамічныя ўмовы працы земляроба. У Дабрывадзе зямля ліхая — V-VI класаў пераважна. Не нагаспадарыш. Трэба жыць было — што там да пісання. Але хацелася б апісаць роднае.

## Як пісаць

— Пісаць у тым часе не пісаў. З выданнем было па-рознаму, а жыць з гэтага немагчыма. Чалавек стараўся, каб не трапіць на дно, каб неяк утрымаць сям'ю. Была ў свой час такая думка, каб роднае запісваць. Крыху пачаў. У мову ўкрадваліся і паланізмы, і русізмы. Калі з „белавежцамі” сустракаўся, дык Алесь Барскі абсмяяў: „Які ты празаік, у цябе столькі паланізмаў”. Проста, знеахвоціў мяне. Але, калі б матэрыяльныя ўмовы былі больш спрыяльныя, калі б іначай склалася жыццё, каб я не быў сіратой... І Валодзю Гайдуку было, ведаеце, цяжка. Потым часу я не меў. А ў Чахах хадзіў на беларускую мову, ліцэй таксама зварухнуў ува мне беларускую жылку.

Надрукаваў апавяданні „Бульба” і „За скібу бацькаўшчыны”. Гэта было аб сітуацыі ў Чахах. Калі паявілася апавяданне, на Сцяпана накінуліся аднавяскоўцы. Успамінаецца. Добра, што Георгій Валкавыцкі (складальнік і рэдактар зборніка *Панароўе*) не забыўся аб ім. Над усімі аўтарамі працаваў, разважаў, правіў. Шкада, што Сцяпан аддаліўся ад „Нівы”, ад рэдактара. Важна, каб пачаткоўца хтосьці падтрымаў, не знеахвоціў.




*На справаздачна-выбарчым сходзе „Белавежы”, 6.10.1962 г. Сцяпан Карбоўскі справа ад жанчыны*

І цяпер не сядзеш. Гэтая зіма крыху вальнейшая была. Можна было б узяцца за ручку, нахіліцца над лістом паперы. Можа... На дзяржаўным хлебе быў, пасля і да хлеба было. Быў час, калі каўбасу еў, і каўбасой закусваў. Рабіў добра. А ўзяцца б за ручку, вывесці слова трапнае. Добра было б.

## Як помнікі будаваў

Кожная работа дакладная мусіць быць. Ці слова, ці помнік. Ад рання да дзесятай вечара таптаўся. Так „на ўра” не зробіш, каб акуратна было. Так утопчашся, што вернешся дахаты, звалішся і спіш. Дзе тут месца на літаратуру. Так, вось, і адбіўся ад культурнага жыцця, і ад калег. Але не забыў таго, што было. Дарабіўся перасілення ног і пыліцы лёгкіх. Прайшло, не вернеш. Пражыў, агульна кажучы, досыць спакойна. Трэба было ісці сярэдзінай праўды. 19 лютага скончыў 64 гады. І з горачкі...

А ці ўседзіш?

## Нобелеўская прэмія за вынаходніцтва

Дзе там уседзіш! Сцяпан Карбоўскі заснаваў фірму, якая гандлявала драўнінным вугалем з Беларуссю. У Пінску заснаваў з сябрам з Гданьска разлеўню газіраванай вады, назвалі яе „Пінкаю”, з новай тэхналогіяй (спачатку былі ў Астрамечаве пад Брэстам). Атрымлівалася някепска, аж у Караганду „Пінку” высылалі. Але крызіс у Расіі ўсё спляжыў.

— Маю такую кемлівасць, што гляну, як што робіцца, і магу ўсё сам скласці.

Гандлявалі з Полацкам, Лепелем, Оршай. Адтуль везлі вугаль у Дабрываду, у разбудаваны будынак старой аборы, там і расфасоўвалі. Сцяпан сканструяваў такую машыну, што калі дырэктар гайнаўскай „Хімічнай” Мараўскі прыязджаў, дык казаў, што яму трэба даць „Нобеля” за вынаходніцтва. Машына для расфасоўвання вугалю была прадукцыйная, чыстая і экалагічная. Калі работніку раптам пабрудзілася манжэта, хапіла атрахнуцца і не мыўшыся чыстым быць. Добры заробак быў. Але ў Беларусі ўсё „дай на карман”, усё тыя подаці, кааперанты сталі хітрыць. Прадаў Карбоўскі тую машыну ў Лепель — спакаваў на аўтафуру, змантаваў яе тамака, растлумачыў, як яна робіць, перадаў сувязі ў Нямеччыне. За 75 тысяч долараў.

— Гэта было маё найбольшае тэхнічнае дасягненне. Шкада, што яны схалтурылі справу, сталі прадаваць то мокры вугаль, то пылісты. А ехаў я з грашыма дахаты, на легкавушцы з польскімі нумарамі. Абступілі бандыты з пісталетамі. Дык я да іх па-свойму загаварыў, стаў прасіцца, тлумачыць, што еду на чужой машыне. А той адзін да аднаго: „Ты, гэта наш нейкі чувак з вёскі, нармальна гаварыць нават не ўмее. Паляк так не гаварыў бы, гэта наш паляшук!” І ў кішэні не заглянулі...

— Цяпер то часу маю быццам больш. Ёсць аб чым распавесці...

**Міра Лукша**

# Уваскрэсенне

Хрыстос нарадзіўся-ўцелясніўся. І ўстанавіў новы век, новую эру і чыстую Хрыстову веру. З Сваімі вучнямі хадзіў, каб усе ў любові жылі — гэтага ў Бога прасіў. Ды над зямлёй павісла чорная хмара і таму неабходны быў выкуп — ахвяра за нашы цяжкія грахі, каб выкінулі мы з сэрца сваё „Я” і чужыя багі. Толькі адзін Ісус Хрыстос можа гэтага дапяць і грахі ўсе нам дараваць. Таму дабравольна на Крыж Галгофы пайшоў. У пакутах, насмешках Сваю смерць знайшоў. Гэта Ён за нас там павіс. Таму, дружа, перад распятым Хрыстом пакланісь. Ён ад смерці нас збавіў і Нябеснага Айца Вечнага ўславіў. А Яго Уваскрэсенне — цуд і перамога. У Хрысце распятым і ўваскрэслым — адзіная дарога. Толькі па ёй нам ісці рашуча наперад з глыбокай і адданай верай. Таму Пасха-Вялікдзень — вялікае свята. Палюбі кожнага, як роднага брата.

**Мікалай Панфілюк**

# Апошняя вячэра

***Найважнейшая прамова — гэта развітальная прамова Ісуса Хрыста, якую сказаў Ён у апошніх хвілінах Свайго жыцця, падчас Апошняй вячэры. Кожны год у Вялікі чацвер ідзем у храм, каб быць удзельнікамі багаслужбы, падчас якой упамінаецца Апошняя вячэра — неабмежаваная Боская міласэрнасць.***

*Да яўрэйскай Пасхі заставаліся два дні. У чацвер вечарам прыбыў Ісус Хрыстос са сваімі вучнямі ў Ерусалім. Урачыстую вячэру пачалі яны з малітвы да Бога Айца, затым селі за стол. Падчас вячэры Хрыстос устаў, зняў верхняе адзенне, аперазаўся ручнікам, узяў міску з вадою і абмыў ногі сваім вучням. Затым апрануўся, наблізіўся да стала і заявіў: „Праўду кажу вам, што адзін з вас выдасць мяне”. Вучні вельмі засмуціліся і па чарзе пыталі: „Ці не я, Госпадзе?” Адзін з вучняў, Іуда, пабачыўшы, што не скрыецца са сваім намерам перад Госпадам, неадкладна выйшаў з пакоя.*

*Пасля выхаду Іуды Ісус Хрыстос устанавіў Таінства Прычасця. Узяў Ён у рукі хлеб, паблаславіў яго, паламаў і, раздаючы вучням, сказаў: „Прыміце, ешце; гэта Цела Маё”. Потым узяў чашу і, падзякаваўшы Богу, падаў яе вучням і сказаў: „Піце з яе ўсе; бо гэта Кроў Мая Новага Запавету, за многіх праліваная дзеля даравання грахоў”.*

*Прамова Ісуса Хрыста падчас Апошняй вячэры змяшчае ўсё, што можа быць патрэбнае чалавечаму сэрцу. Гэтыя словы неабходны ў цяжкіх хвілінах і хрысціяне павінны помніць іх. А вось некаторыя з іх: „Я жыву, і вы жыць будзеце”, „Вы прыяцелі Мае”, „Пайду і падрыхтую вам месца”, „І калі што папросіце ў Імя Маё, тое ўчыню”. Вось пук вечнага святла, якое ў хвіліну развітання кідае Збавіцель у самыя цёмныя закуткі гэтага свету. Калі Хрыстос у развітальнай прамове гаворыць вучням аб будучыні, напамінае, каб у цяжкія хвіліны ўспомнілі Ягоныя словы: „Але сказаў Я вам гэта, каб вы, як прыйдзе той час, прыпомнілі, што Я гаварыў вам пра гэта; не гаварыў жа вам гэтага спачатку, бо быў з вамі”. А гаварыў Ён аб вялікай Бацькоўскай любові, аб Богу і Яго міласэрнасці. Мелі яны запомніць, што калі будзе ім пагражаць смерць, няхай думаюць пра жыццё, а калі будуць іх падпільноўваць ворагі, Ён запэўнівае аб дружбе.*

*Калі будзе нам здавацца, што нідзе для нас няма месца, памятайма, што Ён падрыхтаваў нам месца, калі свет нам зачыніўся, трэба прасіць Яго, а пабачым свет адчыненым. Гасподзь прызначыў гэтыя словы не толькі для дванаццаці вучняў, але для ўсіх вернікаў. Тады няхай усе, якія вераць у Яго, прыпомняць у адпаведны момант Ягоныя словы: „Каб вы (…) прыпомнілі, што Я гаварыў вам пра гэта”.* **(мм)**

*Przeżywamy wspólnie — prawosławni i katolicy — radość płynącą ze Zmartwychwstania Pańskiego. Życzę serdecznie, aby Święta Wielkanocne przyniosły każdej rodzinie, każdej osobie w naszym mieście bogactwo przeżyć duchowych, chrześcijańską nadzieję, oraz wiosenną pogodę ducha. Niech wzajemna miłość, życzliwość i dobro trwają w naszych domach.*

*Miłych, wesołych Swiąt!*

*(—) Ryszard Tur*
*Prezydent Miasta Białegostoku*

# Каця

Жыла ў малой вёсцы Каця. Хадзіла ў школу пешкі, і штодзень праходзіла яна шэсць кіламетраў у суседнюю вёску. На жыццё не наракала. Мела яна добрых бацькоў, у якіх, як і ў яе, былі свае праблемы, але і яны не плакалі над сваім лёсам. Каця была адзіная ў бацькоў. Аб ёй і іншыя казалі, што няма ў нікога такога добрага дзіцяці. І бацькі ён безгранічна давяралі.

Каця змяніла школу, змяніла і сябе. Закахалася. Назваць гэта можна было першым, вялікім каханнем. Кацін хлопец не хацеў, каб хтонебудзь даведаўся аб іхных сустрэчах. А на кожнай сустрэчы былі яны смялейшыя ў адносінах. Стала Каця бываць у людзях, хадзіць на дыскатэкі, сустракацца з калегамі. Спачатку баялася, каб ейны Тамаш не даведаўся, каб не быў зайздросны. І вучыцца Каця добра перастала, можа, з-за Тамаша, а хутчэй з-за самой сябе. Стала раздумваць, каб кінуць школу, выбрацца ад бацькоў, а рэшту жыцця правесці з каханым, раскашавацца гарадской свабодай. Думкі біліся ў Кацінай галаве, нават хацела аб тым сказаць хлопцу, але спужалася, што яе пакіне.

У школе рыхтаваліся вельмі сур'ёзныя экзамены, але Каця не аб гэтым думала. Калі сустрэнуцца? Што будуць рабіць? Перад экзаменам крыху апрытомнела — ад яго залежала здзяйсненне яе прафесійных мараў. Важна было таксама выбрацца з гэтага забітага дошкамі месца. Ведала, што калі маліцца, угаварваць лёс, дык будзе так як хочаш. Спісала нават свае мары, павесіла ў рамцы над ложкам, і так усё мела быць, як замарыла. Экзамен неяк здала, закончыла школу. Насталі канікулы. Каця, замест цешыцца вольным часам, сядзела дома. Ніхто і нішто не было патрэбным, апрача Тамаша. А не бачыліся ўжо два месяцы. Каця ўмірала ад жалю, плакала, а бацькі не ведалі, што з ёю тварыцца…

Пайшла Каця на вяселле да сваёй дваюраднай сястры. Не хацелася ёй ісці, але было б непрыгожа. Вяселле адбывалася ў рэстаране. Каця гуляла, выпіла не адну чарку гарэлкі, павесялела. Ці толькі адзін Тамаш у жыцці?! Пазнаёмілася з новымі равеснікамі, спадабаўся ёй асабліва адзін хлопец. Палічыла, што гэта толькі флірт, званы ёю „пералётам”, але аб ім крыху думала. Праз два дні сустрэлася з Томкам. І нічога не здарылася, адно пахадзілі, паразмаўлялі. Ці іх дарогі цалкам разыдуцца?

Каця плакала, не магла дайсці да сябе. Але час лечыць раны. На вуснах дзяўчыны стала паяўляцца ўсмешка. На другім вяселлі, на якое была запрошана, сустрэла таго, з кім фліртавала на папярэднім. У гэты раз дазволіла сабе на ўсё. Абдымалася, цалавалася з ім пры людзях, прападала на дварэ. А людзі ж вочы маюць. Праз два дні сустрэлася з Томкам. Сказала яму, што нічога іх ужо не спалучае, і ні яна, ні ён не кахаюць адно аднаго. І няхай кожны ідзе сваёй дарогай…

Каця раптам захварэла. Раней усё было ў парадку з яе сэрцам, не хадзіла па лекарах. Аслабленая, праляжала два тыдні ў хаце. І раптам раніцай не ўстала.

Прыходзілі людзі да Каці на магілку, шкадавалі і яе, добрага дзіцяці, і ейных бацькоў. І Тамаш прыйшоў, кветкі прынёс. Што думаў, невядома.

**Ева Калбасюк**

# Вясна

*Вясна — пара найпрыгожшая,*
*Яна пара ўжо цяплейшая.*
*Прыходзіць, час уцякае,*
*Снег і лёд забірае.*
*Раку ад лёду асвабадзіла*
*І зноў у ход яе пусціла,*
*Камары ўжо ў ступкі б'юць,*
*Што ідзе вясна, усім нясуць.*
*Буслоў ляціць сюды багата,*
*Глядзяць згары, дзе іхня хата.*
*Жаваранак вясну страчае,*
*Свае ноткі выцягае.*
*Усюткі дрэвы абудзілісь,*
*Бы нанова нарадзілісь.*
*Уся прырода ажывае,*
*Вядома — дык вясну ўжо мае.*
*Пташкі ўсе хочуць прылятаць,*
*Цяжка ўсіх іх апісаць.*
*Тут сваіх дзетак радзіць будуць,*
*Прыйдзе восень — аб нас забудуць.*
*Цяпер вясна ўжо не такая*
*Як была ў нас былая:*
*Калісь жанчыны басанож ідуць,*
*Палатно мачыць нясуць.*
*Няма каня — трактар у полі,*
*Каня асвабадзіў з няволі.*
*Ужо я каробкі не нашу,*
*Толькі на трактары сяджу.*
*Конь у баразне ў плузе не бывае,*
*Бацька за ім не паступае.*
*Кароўкі на пашы не мычаць,*
*А рэнцісты на кладачцы сядзяць.*
*Шкада, што трэба развітацца*
*І з даўгапісам папрашчацца.*
*Прыйдзе час, пра лета, знаю*
*Напішу, што панімаю.*

**Уладзімір Сасна**
**Пашкоўшчына**

# Няшчасная шапка

*Ванька і Адам нарадзіліся ў вёсцы Т. Падляшскага ваяводства. У юнацкія гады яны дружна сябравалі, заўсёды былі разам. Іхняе сяброўства перарвала другая сусветная вайна. Лёсы сяброў у час ваеннага ліхалецця склаліся па-рознаму, аднак яны шчасліва вярнуліся з вайны і аднавілі сяброўства. А калі пажаніліся, сталі па жонках сваякамі. Далей памагалі адзін аднаму.*

*Прыхаджане выбралі іх абодвух у царкоўнае праўленне. Добра яны даглядалі царкоўных спраў, клапаціліся каб царква прыгажэла, рамантавалі яе. Недзе дзесяць гадоў таму Ванька купіў сабе рускую шапку „папаху”. Адаму таксама спадабалася, купіў сабе падобную. У гэтай парафіі заўсёды на трэці дзень Вадохрышча настаяцель служыў малебен за царкоўны хор і папячыцеляў. Пасля быў наладжаны супольны абед, падчас якога Адам з Ванькам пасварыліся за шапку (Адам падазраваў Ваньку, што памяняў шапкі). Іхняя дружба, якая доўжылася гадамі, у адзін момант разляцелася. Так яны пасварыліся за тую няшчасную шапку, што па сённяшні дзень не размаўляюць. Адам выкінуў Ваньку з царкоўнага праўлення і хоча, каб той увогуле перастаў прыходзіць.*

*Максіма, таксама папячыцеля, спасцігла няшчасце, ён паламаў нагу і доўга ляжаў у бальніцы. Яго таксама адклікалі з царкоўнага праўлення. Цяжка Максіму было выстаяць у царкве падчас багаслужбы. Даў ён дошку, каб зрабілі лаўку. Пасля Максім з Ванькам сядалі разам на той лавачцы. Убачыў гэта Адам і перанёс лаўку на сам перад храма, каб Ванька з Максімам не сядалі на ёй.*

*На маю думку, трэба каб свяшчэннік усіх памірыў і зноў каб усе жылі ў згодзе, бо ў царкве трэба маліцца, а не сварыцца.*

**Мікалай Лук'янюк**

**Андрэй Самасей**

# Наш прэзідэнт — доктар

*Прэзідэнту пастаянна*
*Дакучалі ў прэсе шмат,*
*Што зусім магістра звання*
*Ён не мае акурат.*

*Што праверылі як быццам*
*Гданьскі універсітэт,*
*Дзе калісьці стаў вучыцца,*
*Там магістра прасты след.*

*Прэзідэнту ў Ізраілі*
*Надышоў шчаслівы дзень,*
*Урачыста прыдзялілі*
*Яму доктара ступень.*

*Можа сёння пасмяяцца*
*З прэсавых ён смельчакоў:*
*— Годзе вам мяне чапляцца,*
*Я ўжо ў дактары пайшоў.*